Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ
28
1933 г.
ПЯТНІЦА
№ 164 (4708)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

АДКРЫУСЯ ЗЬЛЕТ УДАРНІКАЎ СПЛАВУ

Учора адкрыўся першы ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сплаву. На зьлёт прыбылі 226 дэлегатаў.

Зьлёт адкрыў старшыня БРК саюзу рабочых лесу і сплаву тав. АЛЬПЕРЫН.

У склад прэзыдыуму зьлёту абраны 33 чалавекі, сярод іх т. т. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, РЫСКІН, ЖАБРОЎСКІ, ІВАНОЎ, ГАЛАДЗЕД, ЛЫЧОЎ, КАВАЛЬЧУК, ЧАРВЯКОЎ, ГЕРЦОВІЧ, ПЫЖЫКАЎ, ЛІСКОВІЧ, АЛЬПЕРЫН, КАЗІМІРОВІЧ, РОЗІН, МІЗІНАЎ (ЦК саюзу рабочых лесу і сплаву), ШАПІРА і ўдарнікі з месц: ГЕРАСІМОВІЧ, БУРЫ, НАВАК ГАНКА, ЖАРЭЎНКАВА АРЫНА, РАГАВАЯ ЎЛІТА і інш.

У ганаровы склад прэзыдыуму абраны Палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. РУДЗУТАК, ПОСТЫШАЎ, ГІКАЛО, ТЭЛЬМАН, КОРЧЫК, ШВЭРНІК, ЛОБАЎ, АНЦІПАЎ, САХАРАВА.

З дакладам аб ходзе сплаву і задачах ударнікаў сплаву выступіў упаўнаркамлесу па БССР тав. РОЗІН. Пасьля дакладу тав. Розіна пачаліся спрэчкі. Першымі выступілі т. т. ШАМАНЮК (ударнік сплаву Парыцкага вучастку) і ГЕРАСІМОВІЧ (ударнік сплаву Бабруйскага вучастку).

З вялікай увагай зьлёт заслухаў выступленьне старшыні ЦК саюзу рабочых лесу і сплаву тав. МІЗІНАВА.

Зьлёт паслаў прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б) — тав. СТАЛІНУ.

ЗЛАМАЦЬ САБАТАЖ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Апошнія пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб перабудове работы чыгуначнага транспарту, распрацоўка якіх праходзіла па ініцыятыве, бліжэйшым актыўным удзеле і непасрэдным кіраўніцтве тав. СТАЛІНА, зьяўляюцца ўзорам канкрэтнага кіраўніцтва асобнымі галінамі народнай гаспадаркі з боку нашай партыі, уяўляюць сабой шырокую бальшавіцкую праграму дзеяньня, якая ў поўнай меры забясьпечвае ўздым транспарту да ўзроўню задач другой пяцігодкі.

Дзеючі-дзе ўжо ёсьць самазаспакаеньне, што, маў, «мы ўжо перабудаваліся». Такія разважаньні ёсьць рэзультат фармальнай перабудовы, а не перабудовы па сутнасьці. Сутнасьць бальшавіцкай перабудовы чыгуначнага транспарту заключаецца ў тым, што ломка збанкрутаваных канцылярска-бюракратычных мэтадаў кіраўніцтва загадамі і цыркулярамі і замена іх выразнай сыстэмай кіраўніцтва, на аснове цьвёрдага адзінаначальня, гаспадарчага разрахунку, правільнай аплаты працы, кантролю і праверкі выкананьня гарантуе рашучае паляпшэньне работы чыгуначнага транспарту. Гутарка ідзе не аб «чарговай» рэарганізацыі, не аб зьмене толькі формы кіраўніцтва, гутарка ідзе аб карэннай зьмене і формы іх арактару кіраўніцтва, гутарка ідзе аб выхаваньні новых навыкаў работы і кіраўніцтва.

Без паляпшэньня мэтадаў, без павышэньня якасьці партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва нельга выканаць тыя грандыёзныя задачы, якія пастаўлены ў другой пяцігодцы. Вось чаму партыя і ўрад настойліва патрабуюць неадкладна, хутка, апэрацыйна, ДА 1-га ЖНІЎНЯ закончыць перабудову органаў кіраўніцтва транспарту зьверху данізу, перабудову мэтадаў кіраўніцтва, перабудову зарплаты, перакідку ІТР з канцылярый на вытворчасьць і г. д.

Як-жа ў нас па чыгунках БССР выконваюцца гэтыя гістарычныя пастановы партыі і ўраду?

Трэба проста сказаць, што перабудова ідзе зусім дрэнна, што яна агідна зацягнулася. Аб гэтым з усёй бальшавіцкай рашучасьцю сказаў толькі што закончыўшы работу VII аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які на спэцыяльным пасяджэньні разам з партыйным актывам Менску абгаварваў гэта пытаньне.

У той час, як шырокія масы рабочых-чыгуначнікаў сустрэлі пастановы партыі і ўраду з вялікім уздымам, чыноўнікі з апарату, часта з парт'білетам у кішэні, якім жаль пакінуць насіджаныя месцы, сустрэлі іх варожа.

«ЗЬВЯЗДА» зьмяшчала рад матар'ялаў, якія сьпіталізавалі аб злачынкай зацяжцы перабудовы, аб фактах сабатажу пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР. Сёньня мы маем магчымасьць прывесьці яшчэ дзесяткі прыкладаў таго-ж парадку.

Сумны ўрок з намесьнікам дырэктара МБВ дарогі БІРУКОВЫМ (зараз выключаны з партыі і зьняты з работы), які сабатаваў рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК і выступіў з паклёпам супроць ЦО «Правды», ня ўсюды ўлічан.

Хіба дапушчальна, што да апошніх дзён апарат Упаўнаркамшляхоў зносін пры СНК БССР ня толькі не перабудаваўся, але фактычна ня ўключыўся ў барацьбу за рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК. Хіба можна чым-небудзь апраўдаць тое становішча, што апарат Упаўнаркамшляхоў зносін знаём аб перабудове на мясцох толькі па копіях загадаў, якія паступаюць з райкіраўніцтваў? Практычны ўдзел апарату заключаўся ўсяго толькі ў тым, што адзін інспэктар тав. СЬЦЕПАНОВІЧ добраахвотна прымацаваўся да дэпо Менск для дапамогі ў перабудове, затое другі інспэктар ШАЛКОЎ і да гэтага часу сядзіць у канцылярыі і займаецца чым толькі хочаце, але ня пытаньнямі перабудовы. Гэта-ж факт, што з моманту апублікаваньня пастаноў СНК і ЦК ня было ні аднаго выезда на раёны інспэктароў. Хіба такі «ўдзел» апарату ў перабудове можна быць чым-небудзь апраўдан?

Начальнік менскага вагоннага дэпо ЛЯШЧЫНСКІ да апошняга дня ня браўся за перабудову толькі таму, што па яго «кампэтэнтнай» думцы пастановы партыі і ўраду на вагоннае дэпо не распаўсюджваюцца. Гэта ў той час, калі пастановамі СНК і ЦК вагоннаму парку аддаецца асабліва важнае значэньне, калі іменна таму вагонная гаспадарка выдзяляецца ў самастойную гаспадарчую адзінку.

Выключна абураючы сабатаж меў месца на заводзе імя МЯСЬНІКОВА. Для дырэктара гэтага заводу — ЗОНТАВА пастановы СНК і ЦК аказаліся невыстарчальнымі. Ён 12 ліпеня, тыдзень пасьля іх апублікаваньня, паехаў у Маскву за «ўзгадненьнем», а свайму намесьніку ГАЛЬЦАВУ даў дырэктыву: «Да майго прыезда ніякай перабудовы не рабіць». Бюро партыйнага калектыву ня ўлічыў недазаніна гэтага факту і фактычна не рэагавала гэтага факту і тарыят Менгаркому КП(б)Б выключыў ЗОНТАВА з партыі і зьняў з работы, ГАЛЬЦАВУ вынес вымову, а ўсяму складу бюро парткалектыву за спаважную дэкларацыйнасьць, прымірэнчыя адносіны да сабатажу — суровую вымову з папярджаньнем. Менгарком КП(б)Б адначасова папярэдзіў, што калі ў бліжэйшыя тры дні на заводзе ня будзе праведзена перабудова работы, будзе пастаўлена пытаньне аб партыйнасьці ўсіх членаў бюро.

Пастанова СНК і ЦК патрабуе перабудовы работы ня толькі гаспадарчых органаў, але і партыйных, прафсаюзных і кааперацыйных арганізацый транспарту.

Факты гавораць, што гэта перабудова ідзе зусім марудна. Партыйная ячэйка ВІЦЕБСКАГА райкіраўніцтва, на чыле з сакратаром АРЖАНАВАЙ, сабатавала пастановы партыі і ўраду, нічога не зрабіла для іх рэалізацыі. Найбольш яркі ўзор абураючага сабатажу паказаў гомельскі райпрафсаюз на чале з старшынёй ГРЫБАНАВЫМ (гл. «Зьвязду» № 163). Камуністы гэтага райпрафсаюзу (ГРЫБАНАЎ, АНУФРЫЕЎ, ВАСІЛЬЛЕЎ) ня толькі ня прыступілі да перабудовы прафработы, але сваімі актыўнымі дзеяньнямі тармазілі агульную перабудову транспарту. Старшыня райпрафсаюзу ГРЫБАНАЎ знайшоў найбольш «зручны час» у адказны момант разгортваньня перабудовы транспарту паехаць у Маскву для набыцьця... аўтамабілю.

Перад прафсаюзамі пастаўлена выключная важнасьці задача — дапамагчы рэарганізацыі сыстэмы зарплаты і нармаваньня працы. Гомельскі райпрафсаюз фактычна ігнараваў гэту справу. Сьпіталы аб слабым удзеле прафсаюзаў у гэтай рабоце паступаюць ня толькі з Гомеля. Прафсаюзы павінны памятаць, што іменна на ўдзеле ў перабудове сыстэмы зарплаты і нармаваньня будзе праверацца якасьць іх работы.

Зусім нездавальняюча праходзіць перабудова і органаў транспартнай кааперацыі. Да 1-га жніўня ТСТ (транспартна-спажывецкія таварыствы) павінны быць рэарганізаваны ў ОРС (аддзелы рабочага снабжэньня), непасрэдна падпарадкаваныя начальнікам раёнаў і дэпо. Да апошніх дзён яшчэ на праведзена нават арганізацыйнае афармленьне. Некаторыя кааперацыйныя і гаспадарчыя парторганы (Ворша, Віцебск), думаюць абмежавацца проста пераменай шыльдаў. Партыя і ўрад паставілі задачу — карэнным чынам перабудаваць сыстэму і мэтады арганізацыі рабочага снабжэньня — гэтага важнейшага вучастку барацьбы за ўздым транспарту, а апартуністы, чыноўнікі хочуць зьвесьці гэта да простай фармальнай зьмены назваў. Неадкладнае паляпшэньне рабочага снабжэньня, паварот яго тварам да ўдарніцтва, тварам да вытворчасьці — у гэтым сутнасьць рэарганізацыі. Рабочае снабжэньне павінна стаць магутным вагаром выкананьня трэнфінпляну.

За ход перабудовы транспарту нясуць у першую чаргу адказнасьць камуністы-чыгуначнікі. Зусім ганебныя, нявартыя члена партыі, зьяўляюцца факты адмаўленьня некаторых камуністаў ісьці на вытворчасьць, на нізавую работу. Вось некалькі прыкладаў. Інжынэр-камуніст Жлобінскага райкіраўніцтва ЕЎДАКІМАЎ катэгарычна адмовіўся выехаць на лінію, куды ёй прызначан. У гомельскім дэпо член партыі і член бюро парт'ячэйкі ЛІС, назначаны брыгадзірам, яшчэ ня прыступіў да працы і імкнецца ўвільнуць ад яе. Сама перасоўка кваліфікаваных кадраў ня ўсюды працца правільна. У ВОРШЫ, ВІЦЕБСКУ асноўныя кадры перасунуліся толькі з аднаго памяшканьня ў другое. На аддаленыя станцыі, дэпо не папаў ні адзін тэхнік, ні адзін інжынэр. Дырэкцыя МБВ і заходніх чыгунак пры разьмеркаваньні работнікаў таксама выходзіла з гэтага прынцыпу — бліжэй да раённага цэнтру.

Стварэньне спрыяючых умоў працы і бытавых умоў перакінутым работнікам — першачарговы абавязак чыгуначных арганізацый. Факты ігнараваньня начальнікам менскага дэпо ВАЙДЗХОЎСКІМ пытаньняў прадастаўленьня кватэр новапрыбыўшым работнікам, факт адмаўленьня начальнікам Жлобінскага дэпо ПІНКІНЫМ і кіраўніком будаўнічага вучастку РАДЭСВІНСКІМ прыёму прыбыўшых на працу тэхнікаў сьведчыць аб простым супраціўленьні ў асобных зьвеньнях транспарту пастановам партыі і ўраду. Аб гэтым-жа сьведчыць і тое, што добраахвотнае жаданьне інжынэраў Жлобінскага раёну ЯРАШЭЙКА, ГУКА, ТАЛМАКА і раду тэхнікаў паехаць на лінію працаваць ня сустрэла падтрыманьня з боку кіраўніцтва.

Дапамога тэрытарыяльных партарганізацый у перабудове работы чыгуначнага транспарту павінна быць самая актыўная. ЦК КП(б)Б спэцыяльна абавязаў РК КП(б)Б правесьці рад мерапрыемстваў у гэтай галіне і патрабаваў ад іх прымацаваць членаў бюро да чыгуначных раёнаў і вузлоў для практычнай дапамогі ў перабудове. Аднак, сыпналы са ЖЛОБІНА і МАГІЛЕВА (гл. «Зьвязду» № 161) паказваюць, што рад райкомаў партыі недазаніў гэтай справы, палічыў, што пытаньні перабудовы транспарту іх не датычаць. Людзі не зразумелі, што перабудова чыгуначнага транспарту — ня толькі справа партыйных арганізацый чыгунак, але яна зьяўляецца справай усёй партыі. Трэба сказаць, што раённы дый і сам чыгуначны друк слаба змагаюцца за рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб чыгуначным транспарце. Гэта ў першую чаргу датычыць жлобінскай райгазэты «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ» і чыгуначнай газэты «ЎДАРНІК», аршанскай раённай газэты — «ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ» і чыгуначнай—«БАЛЬШАВІЦКІ СЫГНАЛ».

Клясавы вораг і яго агентура прабуе і будзе прабаваць усялякімі мерамі перашкаджаць уздыму чыгуначнага транспарту. Стаўшы на чале такой буйнай станцыі, як Віцебск, кулак МЕЛЬНІКАЎ актыўна супраціўляўся перабудове і толькі зараз выкрыт і выключан з партыі.

ТЭМПЫ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ ОРГАНАЎ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ. Апошні пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б вызначыў рад мерапрыемстваў па хуткай рэалізацыі пастаноў СНК і ЦК. Рашуча разьбіваючы сабатажнікаў, сваячасова зрываючы маску з клясавага ворага, выганяючы яго з транспарту, змагаючыся з фармальнай перабудовай, «очковтирательством» і бюракратызмам, павышаючы працоўную дысцыпліну, разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку — удзесяцярым тэмпы сапраўды бальшавіцкай перабудовы транспарту.

Неадкладна пакончыць з ганебным прарывам па сенаўборцы і сеназдачы

ЗВОДКА № 4 АБ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЗАГАТОЎКІ СЕНА СЫСТЭМАЙ БЕЛЗАГАТЗБОЖЖА ПА СТАНОВІШЧЫ НА 25-VII-33 Г. (У ТОНАХ)

Назва сектароў	За пяцідзённку	З пачатку кампаніі	План	Проц. выкананьня
1. Калгасы	6343	10759	16000	67,2
2. Аднаасобнікі	4116	4895	57000	8,6
3. У тым ліку цьвёрд. заданьне	127	144	—	—
РАЗАМ па славянскім сэктары	10459	15697	73000	21,4
Лугасы	188	309	27000	1,1
УСЯГО	10647	15963	100000	16,0

Загадчык сэктару апэрацыйнага ўлікуБелзагатзбожжа ГІНЗБУРГ.

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ старшынь перадавых сельсаветаў

Не дапусьцім разрыву паміж уборкай і здачай дзяржаве с.-г. прадуктаў

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ 26 ліпеня было цалкам прысьвечана абгаварэньню дакладу старшыні ЦВК БССР і СССР тав. ЧАРВЯКОВА аб выніках веснавой сяўбы і задачах сельсаветаў у справе ўборкі ўраджаю і абавязковай здачы дзяржаве с.-г. прадукцыі.

Дэлегаты зьлёту адзін за адным дзяліцца вопытам сваёй работы. Яны падрабязна гавораць аб формах і мэтадах сваёй работы.

Падводзячы вынікі работы, дэлегаты зьлёту выкрываюць недахопы, якія яшчэ ёсьць у нашай рабоце.

Усе выступленьні прасякнуты бальшавіцкай упэўненасьцю ў перамозе. «Задачы, якія стаяць перад намі у справе ўборкі ўраджаю і абавязковай здачы прадукцыі дзяржаве, — кажуць яны,— выканаем з гонарам».

Клясавы вораг, які разьбіт на ўсіх вучастках, яшчэ да канца не дабіт. Ён будзе ўсімі сіламі імкнуцца сарваць пасьпяховае выкананьне гэтых задач. Адсюль чырвонай ніткай ва

КАЛІНОЎСКІ — старшыня Самахвалавіцкага сельсавету (Менскі раён).

ўсіх выступленьнях праходзіць патрабаваньне: «Узмацніць клясавую пільнасьць, мабілізаваць на барацьбу з клясавымі ворагамі ўсю пралетарскую грамадзкасьць, забясьпечыць ахову ўраджаю і сацыялістычнай маемасьці, не дапусьціць разрыву паміж уборкай, абмалотам і здачай прадукцыі дзяржаве, бераргы каня, с.-г. машыны і інвэнтар».

— У нашым сельсавеце кулакі вялі шалёнае наступленьне супроць веснавой сяўбы, — гаворыць у сваёй прамове старшыня Александрыйскага сельсавету, Шкпоўскага раёну, т. Чыжоў. — Кулакі ўсімі мерамі прабавалі сарваць звышраньнюю сяўбу. Партыйная ячэйка і сельскі савет, згрупаваўшы вакол сябе лепшы калгасны актыў, далі ім зьнішчальны адпор. Стаўка кулака аказалася бітай і на гэтым важнейшым вучастку арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і ўзьняцьця ўраджайнасьці. Вялікія плошчы на калгасных палёх аўса і ячменю, якія часткай пасьпелі ўжо, галасуюць добрым ураджаем за звышраньнюю сяўбу.

Далей тав. Чыжоў перадае зьлёту дасягненьні і вопыт сваёй работы.

— Уборка і здача сена дзяржаве скончана па сельсавеце 20 ліпеня. Лён на плошчы 466 га праполат два разы, а 30 проц. яго — тры разы. Праполаты ўсе іншыя яравыя культуры. 3 ліпеня быў праведзен пробны выезд у поле. Выхад паказаў, што калгасы да ўборкі і збожжаздачы ня былі гатовы. Сельсавет і парт'ячэйка мабілізавалі ўсе сілы на ліквідацыю недахопаў, выяўленых у часе пробнага выхаду. Былі нанава адрамантаваны машыны і с.-г. ўборачны інвэнтар, расстаўлены людзі і 16 ліпеня праведзен другі выхад, які прадэманстраваў баявую гатоўнасьць калгасаў да ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве. Здачу прадукцыі правядзем у максымальна скарочаныя тэрміны.

— Наш СТАРЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЁНУ, у мінулым годзе быў самым адсталым, — гаворыць старшыня сельсавету т. САХАНЧУК. — Прычыны гэтага заключаліся ў тым, што ў калгасах усё амаль кіраўніцтва было сканцэнтравана ў руках кулацка-заможных элемэнтаў. 17 кулацкіх гаспадарак былі вычышчаны з калгасаў. Ва ўсіх калгасах створаны дэпутацкія групы, якія, заключыўшы паміж сабой сацдагавары, шырока разгарнулі масавую работу ва ўсіх калгасах за максымальныя нормы выпрацоўкі, за раньні выхад у поле, за недапушчэньне прагулаў, за барацьбу з лодырамі і рвачамі. Усё гэта забясьпечыла посьпех у сяўбе і сенаўборцы. Да ўборачнай кампаніі сельсавет падрыхтоваў. Праверан і адрамантаван увесь с.-т. інвэнтар і машыны. Праверены гумны і сьвірны, дзе будзе хавацца збожжа, вылучаны лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі кладаўшчыкамі.

* * *

Нарком асьветы БССР т. ЧАРНУШЭВІЧ завастрыў увагу зьлёту на задачах культурна-асьветных і дашкольных устаноў і ўсіх асьветнікаў у часе ўборкі і здачы дзяржаве с.-г. прадукцыі, а таксама на пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Інфармуючы зьлёт аб тым, што зараз у БССР ёсьць 3.400 дзіцячых дашкольных устаноў, ня лічачы сеткі Наркамаховы здароўя і што гэтымі ўстановамі ахоплена 100 тыс. дзяцей, тав. Чарнушэвіч падкрэсьліў неабходнасьць максымальнага паляпшэньня работы гэтых устаноў з тым, каб забясьпечыць поўную магчымасьць жанчынам уключыцца ў актыўную работу па выкананьні тых задач, якія перад намі стаяць зараз у вёсцы.

Падкрэсьліваючы дасягненьні, якіх наша краіна дабілася ў культурным будаўніцтве, старшыня Сяпецкага нацыянальнага яўрэйскага сельсавету т. Левікава ўнесла такую прапанову:

— Надаючы выключна сур'ёзнае значэньне пасьпяховай падрыхтоўцы да новага навучальнага году, ад чаго залежыць пасьпяховасьць работы школ і барацьбы за выкананьне гістарычных пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе, зьлёт перадавых сельсаветаў БССР пастанаўляе: 1) уключыцца ва ўсесаюзны агляд падрыхтоўкі да новага навучальнага году, узяўшы на сябе абавязацельствы, якія выпрацаваны НКА БССР і ЦП саюзу працасьветы; 2) актыўна ўключыцца ў выкананьне сацдагавору паміж НКА БССР і Заходняй вобласьцю па падрыхтоўцы да навучальнага году.

Зьлёт аднадушна прыняў прапанову тав. ЛЕВІКАВАЙ і пастанавіў заклікаць усе аставшыя сельсаветы БССР уключыцца ў агляд.

* * *

Усе мерапрыемствы, якія зараз праводзяцца на вёсцы, шчыльна зьвязаны з пытаньнямі фінансаў. Між тым, рад раёнаў ня выканалі даных ім фінансавых пляноў, асабліва па мабілізацыі сродкаў. Гэта гаворыць аб поўнай недаацэнцы партыйным і савецкім кіраўніцтвам раду раёнаў фінансавай работы наогул. Ня выконваючы з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал фінансавых заданьняў, гэтыя раёны не запяліся вывучэньнем прычын зрыву ў іх раёнах выкананьня важнейшых палітычна-гаспадарчых заданьняў, — так зазначыў у сваёй прамове наркамфін БССР тав. ХАЦКЕВІЧ і заклікаў сельсаветы мабілізаваць пад кіраўніцтвам партарганізацый усе сілы на пасьпяховае выкананьне фінпляну.

* * *

Актывістка-жанчына, намесьнік старшыні Каралішчавіцкага нацыянальнага польскага сельсавету, Менскага раёну, тав. Буйніцкая падзялілася вопытам сваёй работы. У Каралішчавіцкім сельсавеце ў нядаўнім мінулым мелі моцны ўплыў шавіністычныя, клерыкальныя элемэнты, яны ўсю сваю работу накіроўвалі на зрыў мерапрыемстваў партыі і ўраду. Аднак, шырока разгорнутай масавай работай, праз створаныя сэкцыі пры сельсаветах і дэпутацкія групы пры калгасах і ўцягненьне ў практычную работу сельсавету шырокага актыву калгасьнікаў, сельсавет дабіўся вялізарнейшых герамог на пасеўным фронце і ў справе падрыхтоўкі да ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве.

Калі раней, нават некалькі месяцаў таму назад, у рэлігійных сьвяты калгасьнікі ня выходзілі на работу, дык зараз выходзяць усе як адзін, прычым у рэлігійныя сьвяты выхад на работу часта нават лепшы, як у звычайны дзень.

* * *

Прывітальную прамову т. Ланкоўскага ад 30-тысячнага калектыву рабочых пекінградзкага заводу «Красный путиловец» зьлёт сустракаў гучнымі воплескамі. Тав. Ланкоўскі, вітаючы зьлёт старшынь перадавых сельсаветаў, заклікаў усе сельсаветы і працоўнае насельніцтва БССР па-бальшавіцку змагацца за перамогі ў сацыялістычным будаўніцтве і са свайго боку запэўніў, што пралетары «Красного путиловца», як і ўсе пралетары гор. Леніна і ў далейшым будуць зьяўляцца авангардам пралетарскай рэвалюцыі, як зьяўляліся да гэтага часу.

* * *

Як расставіць лепш сілы? Як арганізаваць работу ў брыгадах? — вось пытаньні, якім зьлёт шмат аддаў увагі. Ці лепш паставіць разам вялікую колькасьць каскоў, ці гэту колькасьць разьбіць на невялікія зьвеньні?

Практыка работы пасасобных сельсаветаў і калгасаў як у часе сяўбы, так і ў часе касьбы, галасуе за зьвяно. Зьвяно дае магчымасьць кантраляваць работу кожнага калгасьніка і не дае лодырам, рвачам і прагулышчыкам атрымліваць працадні за кошт прыкладнай работы сапраўдных ударнікаў-калгасьнікаў.

Вельмі яркі і пераканаўча гэта было даказана старшынёй Даманавіцкага сельсавету, Клімавіцкага раёну, Прудзінкавым.

— У нас з першага пачатку выходзілі калгасьнікі касіць брыгадамі ў 30-40 чалавек, адзін за адным. Здаецца, усе касілі вельмі добра, а ўстаноўленыя вытворчымі плянамі нормы ня выконваліся. Наадварот, калі мы брыгады разьбілі на зьвеньні, па 4-5 чалавек, і паміж кожнай брыгадай, а ў брыгадах паміж кожным зьвяном заключылі сацдагавары на лепшую работу,— нормы пачалі перавыконвацца і значна ўзьнялася якасьць работы.

* * *

З вялікай прамовай аб задачах уборкі і здачы сельгаспрадукцыі дзяржаве выступіў намесьнік старшыні СНК БССР і нарком зямляробства т. БЭНЭК.

— У некаторых работнікаў сельсаветаў, раёнаў і цэнтральных устаноў укаранілася надавычай дрэнная традыцыя. Яны лічаць, што раней трэба скончыць уборку, а потым прыступаць да загатовак. З гэтай нікуды ня годнай апартуністычнай традыцыяй павінна весьціся самая рашучая, самая бязьлітасная барацьба. Ніякага разрыву паміж уборкай і збожжаздачай не павінна быць. Збожжаздача павінна праходзіць адначасова з уборкай...

Далей г. Бэнэк падрабязна спыніўся на заданьні і правільным дозладзе і выкарыстаньні конскай цягавай сілы і іншых задачах, якія стаяць перад намі і на выраўнаньне якіх павінны быць мабілізаваны ўсе сілы.

* * *

З прывітальнай прамовай выступіў пралетарскі пісьменьнік АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ. Ён падкрэсьліў асоб ліваясьці клясавай барацьбы ў літаратуры, дзе клясава-варожыя элемэнты імкнуцца ў завуаляванай форме працягнуць свае варожыя погляды. Зазначыўшы вялікае значэньне надыходзячых усесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў савецкіх пісьменьнікаў, якія прадэманструюць перамогі на літаратурным фронце і вызначаць далейшыя задачы работы па разьвіцьці літаратуры, тав. Александровіч запэўніў зьлёт што...

— Мы, пралетарскія пісьменьнікі, пабудуем такую літаратуру, якой ня ведала ні адна краіна сьвету і якая цалкам адаб'е героіку нашых дзён.

Гэта заява была спаткана бурнай авацыяй.

У заключэньне тав. Александровіч

БУЙНІЦКАЯ — нам. старшыні Каралішчанскага польскага нацыянальнага савету (Менскі раён).

прачытаў урывак сваёй паэмы.

* * *

— Камсамол БССР як сьлед яшчэ ня ўзяўся за пытаньні аховы ўраджаю, убокі, складаных памяшканьняў і арганізацыі самой здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве, — гаворыць у сваім выступленьні сакратар ЦК ЛКСМБ т. ЛЯХАЎ. — У гэтым напрамку камсамольская ячэйкі працуюць нездавальняюча. Неабходна зараз-жа расставіць сілы так, каб пад кіраўніцтвам парт'ячэек, камсамол адыгрываў вядучую ролю ва ўсіх с.-г. кампаніях у кожнай брыгадзе і на кожнай с.-г. рабоце.

* * *

Усяго на раніпнім пасяджэньні выступіла 25 чалавек, у тым ліку т. СКАРАХОД — старшыня Ляхавіцкага сельсавету, Лепельскага раёну, ФРУМКІН — нач. Галоўдартрансу БССР, ПРОХАРАЎ—старшыня Мяркулевіцкага сельсавету, Рагачоўскага раёну, НІЗАЎЦОЎ —упаўнаважаны па вызначэньні ўраджайнасьці пры СНК БССР, ЧЭРАБУХА — старшыня Казуліцкага сельсавету, Бабруйскага раёну, ШЛЕЙЕР — з Дзяржынскага раёну, ДУБІНА — старшыня ЦС ААХ БССР, КУЗЬМІН — наркам'юст, ЛІОКУМОВІЧ — старшыня Асташкаўскага сельсавету, Мазырскага раёну, ЛІЦІН — Васілевіцкага сельсавету, Рэчыцкага раёну і інш.

Зьлёт заслухаў прамову т. ЯКАЎЛЕВА — старшыні Хмеліцкага сельсавету, Заходняй вобласьці, у якой ён перадаваў вопыт сваёй работы.

Зачыненьне зьлёту

На вячэрнім пасяджэньні 26 ліпеня працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Чарвякова. У спрэчках выступілі т. т. ШАВЕЛЬ (Слецкі сельсавет, Пухавіцкага раёну), МАЦЬВЕЕВІЧ (Велішкоўскі сельсавет, Лёзьнянскага раёну), САДОЎСКІ (Старобінскі сельсавет, Старобінскага раёну), ГОФМАН (Копыскі м. савет, Аршанскага раёну).

Зьлёт віталіі прадстаўнікі менскіх прадпрыемстваў: ад заводу «Камунар» — тав. АКУЦЕНКА, ад заводу імя Варашылава — тав. ЛАНЕЎСКІ і ад абутковай фабрыкі — тав. ФЕЙГІН.

Бурнымі аплёдысмэнтамі зьлёт сустроў зьяўленьне на трыбуне сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА. Тав. Шаранговіч выступіў з вялікай прамовай, якая многа раз перапынялася воплескамі дэлегатаў зьлёту.

Зьлёт заслухаў і зацьвердзіў тэкст прывітальных тэлеграм т. т. Сталіну, Калініну, Молатаву і Гікало.

Пасьля гэтага старшыня СТАРЧАЎСКАГА сельсавету ад імя дэлегацыі Слуцкага, Бабруйскага і Старадарожскага раёнаў зачытаў адозву да ўсіх сельсаветаў, калгасьнікаў, калгасьніц і працоўных аднаасобнікаў БССР. Зьлёт прыняў на сябе рад абавязацельстваў па пасьпяховаму і сваячасоваму правядзеньню ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве.

Пасьля гэтага старшыня ЦВК БССР і СССР тав. А. Г. ЧАРВЯКОЎ выступіў з вялікай заключнай прамовай, у якой падвёў вынікі работы зьлёту.

КАЛГАСЫ МЕНШЧЫНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ НА УБОРКУ

ПЕРШЫМ У МЕНСКІМ РАЁНЕ ВЫШАЎ НА ЎБОРКУ КАЛГАС «СВАБОДА», ПРЫГАРАДНАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЗІНЫ ЗЖАТА 1½ ГЭКТАРЫ ЯЧМЕНЮ.

Т. т. Сталін, Варашылаў і Кіраў— на Беламорска-Бальтыцкім канале

ЛЕНІНГРАД, 25. (РОСТА). 18 ліпеня т. т. СТАЛІН і ВАРАШЫЛАЎ прыехалі ў Ленінград і разам з тав. КІРАВЫМ у той-жа дзень выехалі на Беламорска-Бальтыцкі канал. Азнаёміўшыся з работай каналу і са станам гідра-тэхнічных пабудоў, выехалі праз беламорскі порт Сарока на Мурманск. У Мурманску т. т. Сталін, Варашылаў і Кіраў агледзелі мурманскі порт і бухту Палярную (Аляксандраўск) у Мурманскай затоцы.

25 ліпеня, вярнуўшыся ў Ленінград і агледзеўшы ленінградзкі порт, т. т. Сталін і Варашылаў выехалі ў Маскву.

МАСАВАЯ УБОРКА ПАЧАЛАСЯ

Жнівень—рашаючы месяц ва ўборцы і здачы прадукцыі дзяржаве

САКРАТАРОМ РАЙКОМАЎ КП(б)Б, СТАРШЫНЯМ РВК, НАЧАЛЬНІКАМ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС І САЎГАСАЎ

Ва многіх раёнах рэспублікі пачалася ўжо масавая ўборка ўраджаю. Між тым, праверка работы ў раёнах, праведзеная ЦК пасьля пленуму, паказвае наяўнасьць самасупакоенасьці і апартуністычнага самацёку ў рабоце. Раённыя і сельскія, партыйныя і савецкія арганізацыі не мабілізаваны яшчэ на баявое правядзеньне ўборачнай і пастаўку збожжа дзяржаве, якая павінна быць у асноўным закончана ў жніўні-верасьні, не разумеюць усёй адказнасьці, якая ляжыць на іх у справе арганізацыі барацьбы за ўраджай.

Кіруючыя работнікі замест таго, каб быць у калгасах, сельсаветах, знаходзяцца ў раённых цэнтрах, праводзяць пленумы, шырокія нарады, у той час, як на важнейшых пытаньнях уборкі і збожжаздачы вызьвілася поўная нездарыхтаванасьць раду раёнаў, МТС, саўгасаў, калгасаў і сельсаветаў. Большасьць раёнаў зрывае сенаўборку і здачу сена дзяржаве (8 проц. выкананьня пляну па здачы сена). У той-жа час у Заходняй вобласьці, якая спаборнічае з БССР, плян сенаўборкі выканан на 80 проц., плян здачы сена дзяржаве выконваецца поўнасьцю праз тры дні. У радзе калгасаў нездавальняючая працоўная дысцыпліна, позьні выхад на работу. Рабочыя пляны ўборкі збожжавых у калгасах і брыгадах не прапрацаваны, не абмеркаваны з калгасьнікамі. Не арганізаваны брыгады возчыкаў, рабочая і цягавая сіла не расстаўлена. Жнівяркі і малатарні не падрыхтаваны. У калгасах не падводзіцца падлік працадзён, калгасьнік ня ведае хоць-бы прыблізна, колькі ён атрымае за працадзень.

ЦК і СНК адзначаюць асаблівае адставаньне ў падрыхтоўцы да ўборкі і збожжаздачы аднаасобніка. Аднаасобнікі не арганізаваны ў дзесяцідворкі. Праверка перадачы абавязацельстваў аднаасобнікам не закончана. Большасьць МТС, зямельных органаў і сельсаветаў ня ведае, колькі адрамонтавана малатарань і як будзе арганізован абмалот у аднаасобнікаў.

Загатоўчыя арганізацыі да гэтага часу не падрыхтавалі

Рашуча выкрываючы і выганяючы са сваіх радоў двурушнікаў, кар'ерыстаў, шкурнікаў, буржуазных

ПЕРАБУДОЎВАЮЧЫ ЎСЮ СЫСТЭМУ РАБОТЫ, ВІЦЕБСКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПАД

ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ПЕРАБУДОВУ

Сёньня мы зьмяшчаем рад матар'ялаў аб ходзе чысткі Віцебскай партыйнай арганізацыі. Чыстка Віцебскай партарганізацыі павінна прыцягнуць увагу ўсёй КП(б)Б у сувязі з тымі глыбачайшымі прарывамі, якія былі дапушчаны мінулым кіраўніцтвам ГК па выкананьні прамфінплану, правядзеньні веснавой сяўбы і ў нацыянальна - культурным будаўніцтве. На 20 ліпеня ў Віцебску праведзена чыстка ў 36 ячэйках, з агульнай колькасьцю праверэных членаў і кандыдатаў партыі — 1.238 чалавек. У гэту колькасьць не ўвайшлі тыя ячэйкі, дзе чыстка пачалася, але яшчэ не закончана.

Папярэднія даныя аб ходзе чысткі паказваюць наступнае. З агульнага ліку прайшоўшых чыстку праведзена з кандыдатаў у спачуваючыя 58 чалавек (што складае 17,6 проц. у адносінах да праверэных кандыдатаў), праведзен з членаў партыі ў кандыдаты 141 чалавек, або 12,6 проц. Выключана з партыі 262 чал., або 18,5 проц.

Гэтыя папярэднія вынікі чысткі цалкам выцякаюць з тэй канкрэтнай абстаноўкі, у якой апынулася Віцебская партыйная арганізацыя.

ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах асабліва завастрыў увагу на тым, што, не гледзячы на налёўнасьць усіх умоў, якія даюць магчымасьць Віцебскай партарганізацыі быць у перадавых радох КП(б)Б, усё-ж яна на працягу апошніх двух год знаходзіцца ў палясе глыбокіх прарываў па ўсіх без выключэньня гаспадарча-палітычных кампаніях.

Прамфінплян з году ў год ня выконваецца. БССР недаатрымала ад віцебскай прамысловасьці на 40 мільёнаў рублёў тавараў.

Бальшавіцкую сяўбу другой пяцігодкі Віцебскі раён ганебна праваліў.

У нацыянальна-культурным будаўніцтве ёсьць грубейшыя скажэньні лініі партыі. Яны зводзяцца да таго, што ранейшае кіраўніцтва гаркому не прыняло мер да мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі на барацьбу з ухілам ад генэральнай лініі і ленінскай нацпалітыкі.

Усе гэтыя прарывы зьявіліся ў рэзультаце таго, што ранейшае кіраўніцтва гаркому ня ўлічыла новай абстаноўкі і новых мэтаў клясавага ворага, не перабудавала сыстэмы кіраўніцтва, не змагалася з клясавым ворагам і яго агентурай так, як гэтага патрабуюць інтарэсы партыі.

Праходзячая зараз чыстка партыі з усёй навочнасьцю ўскрывае гэтыя скажэньні. Зараз ускрываецца вялікая засьмечанасьць арганізацыі клясава-чужымі, нацыяналістычнымі, трацкісцкімі, правазапартуністычнымі, двурушніцкімі элемэнтамі.

З усёй навочнасьцю ўскрываецца таксама тая сямейнасьць, бяспрынцыпная групоўшчына, гніль, якая доўгі час культывавалася ў кіруючых кадрах актыву (суднаўшчына) і якую ў сілу сваёй бясхрыбетнасьці, сямейных адносін не магло ўскрыць і змагацца з ёю былое кіраўніцтва, узначаленае Міцьковым, Кардашэнка, Вэнэлем і іншымі.

Чыстка партыі праходзіць на высокім ідэйна - прынцыповым узроўні. Іменна толькі гэта дало магчымасьць цэламу раду прадпрыемстваў і калгасаў ужо зараз у часе чысткі, ліквідаваць буйнейшыя недахопы.

Новае кіраўніцтва гаркому пры энергічнай дапамозе і апэрацыйным кіраўніцтве з боку ЦК КП(б)Б прыступіла зараз да ліквідацыі тых ганебнейшых прарываў, якія мелі месца ў Віцебскай партыйнай арганізацыі. У рэзультаце чысткі і ўзмацненьня ўвагі з боку новага кіраўніцтва да пытаньняў прамфінплану, сельскай гаспадаркі, нацыянальна-культурнага будаўніцтва і г. д. мы можам сказаць, што ў арганізацыі ёсьць пэўныя зрухі. Праўда, яны зачатковыя, іх трэба разьвіваць, і гэта самы першы абавязак гарадзкога камітэту партыі.

У сыстэме работы самой праверачнай камісіі, узначаленай сакратаром ЦК тав. ЖАБРОЎСКІМ, ёсьць цэлы рад момантаў станоўчага вопыту, якія неабходна перанесьці ва ўсе арганізацыі.

Праведзена значная работа па павышэньні ідэйна-палітычнага ўзроўню камуністаў. Па ініцыятыве гарадзкой камісіі быў праведзен агульна-гарадзкі партыйны дзень з прапрацоўкай дакладаў т. т. КАГАНОВІЧА і АНЦІПАВА аб задачах чысткі. Камісія дапамагла на цэлым радзе прадпрыемстваў нападзіць партыйную вучобу (акупярная фабрыка, ф-ка «Дзьвіна» і інш.). Як правіла, раённая камісія праводзіць апэрацыйныя нарады з ячэйковымі камісіямі па чысткі і тут-жа на-хаду зьнішчаецца рад недахопаў, пераносіцца станоўчы вопыт работы ва ўсе ячэйкі.

Надзвычай важным пачынаньнем камісіі зьяўляецца падрыхтоўка сустрэчы рабочых-ударнікаў з прадпрыемстваў з камісіямі па чысткі. Гэта сустрэча павінна яшчэ больш завастрыць увагу на пытаньнях выкананьня прамфінплану, на павышэньні авангардной ролі камуністаў.

Як станоўчы вопыт, трэба прызнаць адсутнасьць яніх-бы там ні было «хвастоў» у разглядзе апэляцый і зацьвярджэньні пастаноў ячэйковых камісій.

Пастанова ЦК партыі аб Віцебскай арганізацыі зараз прапрацоўваецца ва ўсіх ячэйках. На ліквідацыю ўсіх недахопаў мабілізуюцца шырокія масы партыйцаў і беспартыйных рабочых-ударнікаў. Іменна глыбокая прапрацоўка пастаноў, мабілізацыя ўсіх сіл на ліквідацыю меўшых месца прарываў забясьпечыць Віцебскай партыйнай арганізацыі заняць першае месца ў радох КП(б)Б.

Няма сумненьня ў тым, што Віцебская партыйная арганізацыя, ачысьціўшы свае рады ад клясава-чужых элемэнтаў, рэалізаваўшы ўказаньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, будзе ў першых радох змагароў за генэральную лінію партыі.

Пад знакам заваёвы вытворчых перамог

Чыстка партыі на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» праходзіць пад знакам рашучага выпраўленьня тых глыбокіх памылак, якія былі дапушчаны былым трыкутнікам фабрыкі, у прыватнасьці зьнятым зараз сакратаром парткому Шкфрыньм. Яна праходзіць пад знакам рашучай перабудовы зьнізу да верху ўсёй работы партарганізацыі фабрыкі ўплатнымі сваякам да выкананьня прамфінплану на колькасных і якасных паказальніках.

Саноўна-барскія мэтады работы мінулага трыкутніка фабрыкі, яго поўная адарванасьць ад мас, гніла-ліберальныя адносіны да зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны і параджалі прарыў за прарывам. Прамфінплян зрываўся з кварталу ў квартал. Першы прамфінплян быў выкананы усяго толькі на 75,8 проц.

А між тым фабрыка мела і мае ўсе магчымасьці для поўнага і высокаякаснага выкананьня плану.

Аб мэтадах саноўна-барскага кіраўніцтва былых кіраўнікоў парткому можа сьведчыць хаця-б той факт, што калі загадчыкі цэхаў зьвяталіся да сакратара парткалектыву па пытаньнях бягучай вытворчай работы, дык адказ заўсёды быў адным і грозным:

— «Я нічога не скажу, ідзі сам ламай галаву». Вось гэта «ўстановачка» наконт таго, каб кожны камуніст «ламаў галаву» па свайму ўменьню — характарна да зьнятага зараз кіраўніцтва парткому фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі».

Гніла-ліберальныя адносіны да разгільдяяў дахадзілі да таго, што пасобныя камуністы, накшталт Песіна і іншы ўхадзілі з працы на цэлыя гадзіны рыней тэрміну. Камуніст Хінскі — інструктар цэху паліто — прапускаў па 150 штук з пасаванымі вінамі кожную вымену.

На сёньнішні дзень усяго прайшло чыстку толькі дзьве ячэйкі — прасавальнага і закройнага цэхаў. Чыстка пакуль што ахапіла 125 камуністаў.

Чыстка праходзіць актыўна, пры самым непасрэдным удзеле ўсёй масы рабочых. Рабочыя дапамагалі камісіі на чысткі выявіць і выкрыць неразбіўшыхся бундаўцаў, накшталт Песіна, на чысткі імкнуўшагася даказаць нібы-та рэвалюцыйнасьць Бунду і тое, што Бунд перастаў быць рэвалюцыйным толькі ў 1917 годзе. Гэты бундаўскі кантрабандыст сыстэматычна падрываў прамфінплан, зьяўляючыся самым актыўным бракаробам.

Чыстка з усёй яскравасьцю паказала, што партарганізацыя буйнейшай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» ў асноўным здаровая, моцная. Вось Марковіч — лепшая ўдарніца трасавальнага цэху, вось брыгадзір брыгады імя чысткі т. Паўлаў, здолеўшы за кароткі тэрмін ліквідаваць горы браку і залежаў у бручным цэху, які забясьпечыў сыстэматычнае перавыкананьне прамфінплану. Марковіч, Паўлаў — не адзінкі, такіх як яны — цэлы рад, яны складаюць касьцяк партыйнай арганізацыі фабрыкі. Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб Віцебскай арганізацыі былі прапрацаваны ва ўсіх зьменах і цэхах, яны выклікалі вялізарную хвалю бальшавіцкай самакрытыкі, на аснове якой таксама вырыты рад камуністаў, імкнуўшыхся змазаць палітычную вастрату пастаноў ЦК (Цырлін, Давідовіч, Ліннік).

Абноўлены, узмоцнены трыкутнік пры дружным падтрыманьні ўсіх рабочых ужо дабіўся першых зрухаў. Спецыялісты, якія сядзелі ў канцылярыях, па пастанове дырэкцыі і парткому выйшлі ў цэхі, непасрэдна кіруючы ўсімі працэсамі вытворчасьці. Асноўныя цэхі, параджаўшыя раней прарыў — бручны і пінжачны — пачынаюць выходзіць у рады перадавых. Калі раней былі факты, што па 10 тыс. пар брук ішло на перапрацоўку, дык зараз у цэху гэткае становішча зжыта, бо абноўленае кіраўніцтва цэху замест разгільдяя Казьлянскага сапраўды па-бальшавіцку ўзялося за справу. Спаборніцтва цэхаў стала ператварацца ў жывыя бальшавіцкія справы, рэзультат якіх — выкананьне і перавыкананьне прамфінплану. У выніку спаборніцтва бручнага цэху «А» з пінжачным цэхам, прамфінплян бручнага цэху выкананы за чэрвень на 127 проц., а пінжачнага на 106. Аб паяўнасьці перабудовы кажа тое становішча, што прамфінплян фабрыкі за першую дэкаду ліпеня выкананы на 90,8 проц., за другую дэкаду — на 113,5 проц. Зьмяншаюцца горы браку, перапрацоўка, адчуваецца сапраўдная барацьба за палепшаньне якасьці прадукцыі.

Абноўленае кіраўніцтва парткому (Рохкінд) нядаўна выступіла з каштоўнай ініцыятывай у галіне рабочага шэфства над вёскай. У калгасы Клімаўшчыны ў парадку шэфства пасылаюцца 25 лепшых камуністаў, заключаны сашумовы паміж цэхамі і калгасамі. Адчуваецца значнае ўзмацненьне партыйнай дысцыпліны. Наведваемасьць сходаў дасягнула 98 проц.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б пачынаюць пад кіраўніцтвам абноўленага гаркому КП(б)Б праламляцца на фабрыцы ў жыцьцё. Бліжэй шыя-ж дні павінны прынесьці новыя, яшчэ больш магутныя перамогі «Сьцягу індустрыялізацыі» ў барацьбе за тое, каб вывесьці Віцебшчыну ў рады перадавых раёнаў БССР.

Г. Л.

Справа ідзе аб жывых людзях

[illegible]ка Віцебскага гаркому [illegible] склад партарганізацыі фабрыкі «Дзьвіна» лічыла так: на 1 студзеня 1933 г. — 290 чал., на 1 красавіка — 279, а на 1 ліпеня — дзень пачатку чысткі партарганізацыі — 202 чал.

Дзе-ж дзелася 88 чал.? Ці пагікавіўся гэтым гарком партыі? Справа-ж ідзе не аб простых, сухіх лічбах, а аб жывых людзях, членах камуністычнай партыі.

На жаль, гарком партыі гэтым не цікавіўся. У яго распараджэньні былі вучотныя карткі — гэтым ён і задавальняўся. Пачкамі прыбаўляліся карткі, таксама пачкамі яны выключаліся з картатэкі гаркому. За карткамі жывых людзей ня бачылі. На паперы, мёртвымі палачкамі лічылі склад партарганізацыі. Праяўляўся са мы бяздушны бюракратызм. Працавала толькі канцылярская машына гаркому...

А ў парткалектыве фабрыкі «Дзьвіна» гэтых жывых людзей пачкамі прымалі ў партыю, тут-жа забывалі прынятых і праз некаторы час пачкамі выключалі з партыі «як баляст», як «адарваўшыхся ад партыйнага жыцьця», «за неўплату членскіх узносаў» і г. д. Аб тым, як прымалі ў партыю, сьведчыць прыклад з работніцай Галушка, якая адмовілася ад чысткі, заявіўшы: «Далі мне анкету, а для чаго — ня ведаю. Мусіць тады і запісалі ў партыю».

Кіраўніцтва парткалектыву бязьдзейнічала. Жывую, выхаваўчую работу з кандыдатамі і маладымі членамі партыі яно падмяняла адміністраваньнем, чыноўніцкім камандраваньнем, расправай.

Па прапанове сакратара парткалектыву т. Вэкслера, агульны партыйны сход фабрыкі 5 сьнежня 1932 г. выносіць «мудрую» пастанову: «абавязаць усіх кандыдатаў ліквідаваць запазычанасьць па членскіх узносах, каб у далейшым плаціць своячасова».

Выхаваўчай, масава-растлумачальнай работы кіраўніцтва парткалектыву і партыйных ячэек не праводзіць ніякай. Маладыя кандыдаты і члены партыі адрываюцца ад партарганізацыі усё больш і больш. Запазычанасьць па членскіх узносах расьце. Расьце колькасьць «мёртвых душ».

25 студзеня 1933 г. сход парткалектыву па пастанове бюро, выключае з партыі пачку маладых кандыдатаў партыі: Каралёву, Стальмакову, Бараноўскую В., Раманоўскую, «як неплацельшчыкаў членскіх узносаў».

Парт'ячэйка рамонтнага цэху 25 красавіка абгаварвае характарыстыкі на членаў і кандыдатаў партыі. У пачатку паседжаньня бюро ячэйкі запісвае: «з характарыстыкамі згадзіцца», а ў канцы паседжаньня яно зноў вяртаецца да гэтых-жа таварышоў і ў пратаколе запісвае: «Алейнікава, Марудаву, Калімопава выключыць з партыі за няўплату членскіх узносаў і ненаведваньне партыйных сходаў».

Усьлед за парт'ячэйкай рамонтнага цэху масавае выключэньне з партыі праводзіцца і ў іншых парт'ячэйках. Так, парт'ячэйка часальнага цэху адразу выключыла 9 чалавек.

Такім чынам, на фабрыцы «Дзьвіна» выкідваецца з партыі 88 чалавек, сярод якіх нямала лепшых пралетараў-кадравікоў, узорных на вытворчасьці, перадавых ударнікаў.

Гарком партыі, на чале якога стаяў т. Міцькоў, спакойна рэгіструе гэты факт. І толькі пасьля пастановы ЦК УсеКП(б), які абвясьціў вымову тав. Міцькову, гарком партыі зьнімае з работы сакратара парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна» т. Вэкслер.

На яго месца высоўваецца т. Фінкельштэйн, зьняты з працы на акупярнай фабрыцы за правал работы.

Каму патрэбна такое «палапшэньне» кіраўніцтва?

Былы склад кіраўніцтва гаркому партыі нічога не зрабіў для таго, каб выправіць тыя грубейшыя памылкі ў рабоце парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна», якія адзначаны ў пастанове ЦК УсеКП(б).

Ня дзіва таму, што праверком, які ўжо калі трох тыдняў правоздзіць чыстку партарганізацыі фабрыкі «Дзьвіна», ніяк ня можа дабіцца ад парткалектыву дакладных даных аб складзе партарганізацыі. Лічбы мяняюцца штодня. Сакратары парт'ячэек заняты зараз пошукамі вучотных картак. «Згубіліся» і людзі і карткі іх...

Так, у парт'ячэйцы групы «А» ў першы дзень чысткі праверкому далі карткі на 44 партыйцаў, у далейшым знайшліся на 55 чал., потым — на 59, а ў працэсе чысткі праверкомам выяўлена, што ў гэтай парт'ячэйцы — 63 чал. Значыць, у адной толькі парт'ячэйцы групы «А» было «згублена» 19 партыйцаў, згублена тутжа, на... фабрыцы, у цэхах.

Пра тое, як адрываліся ад партарганізацыі маладыя кандыдаты партыі, як парткалектыў ставіў іх у рады беспартыйных, — расказвае работніца т. Жулева.

— Я працую 13 год на фабрыцы «Дзьвіна». Работніца сартыроўкі. Ударніца. Заўсёды выконваю і перавыконваю нормы. Няма браку. Неаднаразова прэміявана. У 1929 г. уступіла кандыдатам у партыю. Малапісьменная я. Нутром чую задачы партыі, але ведаў мала. Цікаўлюся усім. Першая актывістка. Абралі членам цэхавага камітэту, членам гарсавету. Захацелася мне падвучыцца, каб быць больш карыснай для партыі. Запісалася ў школу малапісьменных. А тут — як толькі заняткі ў школе, дык і пасяджэньне цэхкомаў. Не магу разарвацца!

Заяўляю старшыні цэхкому Пахомавай: «Як-бы перанесьці пасяджэньне цэхкому на вольны дзень ад заняткаў у школе». Яна — ні блізка! «Прыцкны ў цябе. Зрываеш працу», — кажа Пахомава. У парткалектыў на мяне пакрыўдзіліся, злуецца: «Я нянісьменная, але працую, і ты можаш».

Завязаліся склокі. У парткалектыў мяне ня выклікалі. Устаноўкі ня далі. Чую толькі, што пад мяне падкапваюцца.

Абгаварвалі, раз калектыўны дагавор. Аб нормах некаторыя работніцы вашумелі. Пахомава ізноў на мяне заяўляе у парткалектыў: «Жулева зрывае работу», а я і знаць ня знаю.

Ня выклікалі мяне ў калектыў і па гэты раз. Каб паклікалі, паслухалі — можа я і вінавата, можа і не. Паслухалі-б, навучылі. Выхаваць мяне трэба, бо цёмная, адсталая я была. Дык не! Забралі ў мяне кандыдацкую картку для нейкай праверкі і не зьвярнулі. Так і стала я «мёртвай душой».

А партыі я аддана. І зараз працую з партыяй, — закончыла тав. Жулева.

Ці-ж гэта не павучальны факт таго, як бюракраты-чыноўнікі з парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна» сваімі нячулымі, казённымі адносінамі да жывых людзей адпіхваюць ад партыі лепшых работніц і рабочых?

Жулева не адна. Іх — дзесяткі сярод той буйнай пачкі камуністаў, якія выключаны з партыі толькі нядаўна, у колькасьці 88 чалавек.

Вось яшчэ характэрная «мёртвая душа»—т. Віньнікава Аўдакея, член партыі з 1926 г. Яна ў 1928-29 г. г. была членам Віцебскага акругкому і жанарганізатарам 3-га райкому. Старая работніца на фабрыцы. І што-ж? Сакратар парткалектыву фабрыкі тав. Вэкслер прадстаўляе гаркому сьпіс на 26 чал., у якім Віньнікава, як і астатнія, лічыцца «мёртвай душой», быццам ня няма на фабрыцы. Гэты сьпіс перадаецца праверкому. Аказваецца: Віньнікава ёсьць, яна зьвярнулася да праверкому з просьбай яе праверыць на чысткі. У сьпіс 26 «мёртвых» як і Віньнікава, папаў не адзін жывы чалавек, які і зараз працуе на фабрыцы.

І наадварот. Перад праверкомам прайшлі такія людзі, якія нічога агульнага з партыяй ня маюць, але якія, аднак, лічыліся ў партарганізацыі актыўнымі членамі. Вось Халіпская Ганна, член партыі з 1932 г. Праверком у яе пытае:

— Хто такі т. Сталін?

— Ня ведаю.

— У якой партыі састаіш?

— Ня ведаю.

— Калі гандлявала гарэлкай і колькі часу?

— Гадоў пяць, калі было цяжка.

Такія прыклады можна памножыць. На фабрыцы «Дзьвіна» ў партыю ўдзіравалі выпадковы, неправераны элемэнт. Такім чынам, апынуліся ў партыі і такія чужакі, як Савіцкі — былы гандляр, вахмістр чыноўнік, дэзэртыр з Чырвонай арміі, штрэйкбрэхэр у час забастоўкі да рэвалюцыі; Саламонаў Аляксей — сын саматужніка-эксплёататара, які меў 6 рабочых; Турнянскі — выхадзец з Бунду, які зараз ідэалізуе контр-рэвалюцыйную дзейнасьць Бунду, на працы зьвязан з клясава-варожым элемэнтам.

Толькі поўным пяведаньнем твару парт'ячэек і асобных яе членаў, а таксама поўным адрывам ад партыйных і беспартыйных мас бюро парткалектыву, можна вытлумачыць той факт, што ў партыю прабраліся такія варожыя элемэнты. Гэтым-жа тлумачыцца, што на працягу 7 месяцаў сакратаром парт'ячэйкі на фабрыцы быў... беспартыйны Рагажынскі.

Чыстка партыі, якая ўжо набліжаецца да канца на фабрыцы «Дзьвіна», аздаравіла партарганізацыю фабрыкі. Заўважаецца значнае ажыўленьне. Аб гэтым гаворыць факт рэзкага павышэньня актыўнасьці партыйных і беспартыйных рабочых мас на сходах па чысткі, а таксама і на вытворчасьці: прамфінплян зараз выконваецца і перавыконваецца штодзенна, у той час, як за першы і другі квартал ён выкананы толькі на 96,9 проц.

Брыгада камуністкі Базылёвай да чысткі ня выконвала прамфінплян, зараз выконвае на 105 проц., Лебедзева — на 100 проц. і г. д.

Толькі ў час чысткі партыі, пры непасрэднай дапамозе праверкому, даведзены вытворчыя заданьні да варштата і рабочага.

Ачышчаная ад вышадковага, клясава-варожага элемэнту, трапіўшага ў партыю, партарганізацыя фабрыкі «Дзьвіна» зможа ўзначаліць творчую актыўнасьць рабочых мас і вывесьці фабрыку «Дзьвіна» ў рады перадавых прадпрыемстваў сацыялістычнай прамысловасьці.

Задача парткіраўніцтва фабрыкі і гаркому партыі — замацаваць вынікі чысткі, не дапусьціць паўтарэньня мінулых памылак.

Р-ц.

ЛІКВІДАВАЦЬ СПАДЧЫНУ БЫЛОГА КІРАЎНІЦТВА

Веснавая сяўба па Віцебскім раёне паказала, што яго кіраўніцтва не вяло бальшавіцкай барацьбы за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб тэрмінах сяўбы. Гэта ўжо вядомы факт. Аб ім гаворыць пастанова ЦК КП(б)Б, які зьняў з работы кіраўнікоў раёну т. т. Міцькова, Кардашэнка і Вэнэля.

Адная, спадчына мінулага дае яшчэ адчуваць сябе і сёньня. Па прапорцыі Віцебскі раён адстае. На раёну прапорцыя толькі 34,72 проц. збожжавых, 60 проц. ільну і 27,6 проц. гародніны. Бульба акучана па другім разе толькі на 28,8 проц. Дрэнна стаіць справа і з сенаўборкай: па ўсім раёне па натуральных травах скошана толькі 62,5 проц., а ўбрана 64,2 проц. скошанага.

Чыстка партыі, якая цяпер праходзіць у Віцебскім раёне, з усёй недавочнасьцю падкрэсьлівае правільнасьць пастаноў ЦК КП(б)Б. Усё больш выкрываюцца новыя факты дрэннай работы, што прывяла раён да такога ганебнага становішча.

Сялюцкі сельсавет сарваў веснавую сяўбу, злачынна расьцягнуўшы тэрміны да 18-19 чэрвеня пры яўна нізкай якасьці. Упаўнаважаны гаркому т. т. Залескі, Строгін, Ражанскі і інш., якія былі тут у часе веснавой сяўбы, лічылі, што ў ячэйцы гэтага сельсавету ўсё ў парадку, а за імі

Тав. ФІШМАН — герой першай пяцігодкі, лепшая камуністка. (Акупярная фабрыка).

таксама лічыў так і гарком. А што-ж паказвае чыстка? Яна паказвае, што ячэйка засьмечана пераражэнцамі, п'яніцамі, самаснабжэнцамі, лодырамі, што ў ёй панує грубы заціск самакрытыкі.

Сакратар ячэйкі Труханаў — член партыі з 1930 году, рабочы «Чырвонага эталіста», які быў пасланы гаркомам на ўмацаваньне вясковай партарганізацыі, зросься з кулацкімі элемэнтамі, займаўся самаснабжэньнем і п'янкай.

Труханаў горача абараняў былога кулака Восіпава, які пры дапамозе Труханава пралез на пасаду загадчыка МТФ. У МТФ Восіпаў вёў шырокую шкодніцкую дзейнасьць: падсыпаў у корм каровам нарэзаны дрот, бітае шкло, шавецкія цьвікі і г. д., каб толькі зьнішчыць калгаснае стада. Калі калгасьнікі напісалі аб усім гэтым у сельсавецкую насьценгазэту, дык Труханаў, якому адказны рэдактар паказаў гэту заметку, катэгарычна забараніў яе друкаваць. Мала таго, ён забраў гэту заметку ў рэдактара, нібы для праверкі фактаў і схаваў яе.

Калі-ж калгасьнікі пачалі па сходзе выкрываць шкодніцкую дзейнасьць Восіпава, Труханаў проста заявіў: «Усё гэта паклёп. Восіпаў чалавек працаздольны і добрасумленны. Я 25 калгасьнікаў не прамяняю на яго аднаго».

На чыстцы калгасу Труханаў заявіў: «Калі хто-небудзь будзе абараняць асоб, якіх я намецію вычысьціць, то і яго спаткае такі-ж лёс».

У разгар палявых работ ён на лепшым калгасным жарабцы раз'язджае з дачкой жандара Сьмірновай, робіць папойкі з былым афіцэрам-шкоднікам Разумоўскім, загадчыкам крамы сельспажыўтаварыства Жукавым.

Другі член ячэйкі Віташкоў—старшыня калгасу «МОНР», член партыі з 1931 г., займаецца «очковтирательством»: 20 мая рапартуе аб скончэньні сяўбы збожжавых, у той час, калі сяўба фактычна была скончана толькі 18 чэрвеня. Ён самавольна без усякіх выбараў едзе на раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў, а раённыя кіраўнікі зьмяшчаюць яго фатаграфію ў вітрыне лепшых ударнікаў, зусім не цікавячыся, у чым выяўляецца яго ўдарная работа.

Калі пасьценгазэта хацела зьмясьціць заметку аб злачынствах у калгасе, Віташкоў дае рэдакцыі загад: «Катэгарычна забараніць прапускаць у газэту заметкі на мяне і другіх членаў праўленьня. У працыўным выпадку буду выганяць з калгасу».

Загадчык крамы спажыўтаварыства, член партыі Жукаў Іван ліквідаваў сьвінаадкормачны пункт пры сельСТ, нібы з-за недахопу корму, у той час, як былі ўсе магчымасьці ня толькі ўтрымаць наяўную колькасьць сьвіней, але і значна павялічыць сьвіное стада. У часе ліквідацыі пункту з 32 сьвіней толькі 11 трапіла ў райза, а рэшта пайшла ў рукі кулакоў і спажуліптаў.

За гэтым «букетам» ніхто ня бачыў сапраўдных ударнікаў, як тав. Чульба Ягор, член партыі, каваль, які ня толькі з посьпехам выконвае сваю працу ў кузьні, але сыстэматычна дапамагае ліквідаваць прарывы непасрэдна па полі. Яго праўдзівай крытыкі работы ячэйкі ніхто ня слухаў. Сакратар ячэйкі Труханаў заўсёды заціскаў самакрытыку, заяўляючы: «Калі я лічу, што тут усё ясна, дык гэта пытаньне дыскусіі не падлягае».

Пераражэнцы вялі сваю падрыўную работу ў калгасах, а прадстаўнікі гаркому спакойна гастралявалі па сельсавеце і дакладвалі, што ў ім «усё ў парадку». Больш таго, калі бюро парт'ячэйкі параніла зьняць з працы Труханава, гарком КП(б)Б пастанавіў расьсьледаць справу і на гэтым супакоіўся.

Вось ячэйка Замастоцкага сельсавету. Што тут выяўляе чыстка? Сенаўборка пад пагрозай зрыву. У ячэйцы панує заціск самакрытыкі. Старшыня сельсавету Колатаў Мацьней, выхадзец з гандляроў, утаіўшы сваё сацыяльнае паходжаньне, пралез у партыю, Колатаў мае вымову за зрыў калгаснага будаўніцтва, суровую вымову за перапамяшэньне ўраджаю, вымову за зрыў узьняцьця папараў, вымову за невыкананьне збожжазагатовак, скажэньне клясавай лініі і патураньне кулаку, абкладаньне сераднякоў. Ён падае заяву старшыні ЦВК тав. Чарвякову аб адмене высылкі кулаку Сьцяпанаву. Гэтага кулацкага агента Віцебскі гарком да гэтага часу трымаў у партыі, абмежаваўся толькі спатканьнямі. Калгасьнікі, тэрарызаваныя Колатавым, баяліся выступаць на чыстцы.

Член бюро ячэйкі Пласкуноў пры чыстцы калгасу «Замасточа» ад клясава-варожых элемэнтаў уключыў у сьпіс і серадняковаў Алейнікава, Калініна, Гаўрылешка і інш. І калі калгасныя масы выступілі супроць, ён на сходзе назбавіў голасу 43 калгасьнікаў.

Выкрываючы пераражэнцаў і шкоднікаў, чыстка ў той-жа час паказала твар сапраўды адданых камуністаў.

Возьмем хоць-бы тав. Шылаву Марыю з тэй-жа Замастоцкай ячэйкі. Яна батрачка, з 1930 году камсамолка, з 1931 г. кандыдат партыі. Шылава лепшая ўдарніца, чатыры разы прэміявана, намесьнік загадчыка МТФ, брыгадны агітатар. Была дэлегаткай першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Брыгада Гусакова, у якой працуе т. Шылава, лепшая брыгада калгасу. Дапамагаючы актыўнай працы т. Шылавай калгасьнікі добра ўзаралі і своячасова засеялі калгасныя палі. Раньняя сяўба дала добрыя вынікі: Шылава шмат дапамагае свайму беспартыйнаму брыгадзіру Гусакову. Старыкі гавораць: «Век жылі, а ня ведалі, як сеяць. Яна першая навучыла». А Шылава гапарыцца: «Ураджай добры, самага высокага росту чалавек хаваецца». У пэрспэктывах калгасьнікі лічаць, што «на адзін працадзень пасьля выканаўшыя плану збожжаздачы і засыпкі насеннфондаў прыпадае па 4,5 кілёграм збожжа, а летась быў толькі адзін кілёграм».

Калгасьнікі хваляць тав. Шылаву: «Лепшая калгасьніца, партыйка. Усё нам растлумачвае і дапамагае».

І такіх, як тав. Шылава, шмат. На вёсны расьце новае пакаленьне сапраўдных барацьбітоў за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за выкананьне дырэктывы тав. Сталіна — «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі». Яны — здаровае, асноўнае ядро партыі на вёсцы, але яго імёны і не знайшлі віцебскія гора-кіраўнікі.

Чыстка рашуча выкрывае і выкідвае вон пятнодныя адкіды. Партарганізацыя Віцебшчыны становіцца моцна на ногі і новаму кіраўніцтву раёна трэба рашуча павесьці яе ўперад. Усе магчымасьці для гэтага ёсьць — і Віцебскі раён павінен заняць належнае яму на праву перадавое месца ў БССР.

А. Нікалаеў, С. Брайнін.

ШКОДНІКІ НА ІДЭА

Глыбокія прарывы, ускрытыя ЦК КП(б)Б у віцебскай партыйнай арганізацыі, цалкам адносяцца і да ідэалёгічнага фронту. Былое кіраўніцтва ня ўцяміла новай абстаноўкі, новых мэтаў клясавага ворага і ў радзе пытаньняў апынулася ў становішчы гнілога ліберала, за сьпіной якога арудавалі антысавецкія элемэнты.

Узяць хоць-бы, да прыкладу, становішча партыйнай арганізацыі навучальных і культурна-асьветных устаноў раёну. Тут мы сустракаемся з цэлым радам фактаў актывізацыі правазапартуністычных, трацкісцкіх, бундаўскіх, эсэраўскіх, нацыянал-дэмакратычных і іншых клясава-варожых элемэнтаў.

У віцебскім ветэрынарным камбінаце з-за пераражэньня кіраўніцтва і згубы бальшавіцкай пільнасьці бюро партыйнай ячэйкі, доўгі час арудавалі шкоднікі. Сваю антысавецкую дзейнасьць яны часта прыкрывалі фальшыва - нацыянальным сьцягам. Была пабудавана цэлая стройная сыстэма шкодніцкіх тэорый, накіраваных на зьнішчэньне сацыялістычных форм жывёлагадоўлі і растаўрацыю кулацкіх, прышчэпаўскіх гаспадарак.

Да чаго пераражэлася кіраўніцтва, да чаго была згублена партыйная пільнасьць сьведчаць такія факты.

Прафэсар Пэліхаў — рэакцыянэр, у якасьці асноўнага падручніка па ваэтэхніцы рэкамэндаваў студэнтам чытаць біблію. Дацэнт Шчарбовіч рэкамэндаваў студэнтам над відам барацьбы з паразытамі «спальваць гной». Гэта цалкам вынікала з кадрацыцёўска-чаянаўскай установкі, накіраванай на зьнішчэньне ўраджайнасьці.

Чыстка выявіла цэлы букет двурушнікаў, кар'ерыстаў, буржуазных пераражэнцаў, якія зьвілі сабе гнездо ў ветэрынарным камбінаце.

Возьмем самога дырэктара Уварава. Ён актыўны абаронца шкоднікаў, пры хілымік кулачча. Уся яго дзейнасьць была накіравана на заахвочваньне клясава-варожых элемэнтаў. Уварав высоўваў на кіруючыя работы шкодніка, накшталт Барадзёнка, абараняў кулакоў, напрыклад, Шадрына, які быў зьвязан са шкодніцкімі элемэнтамі, у прыватнасьці з вядомым шкоднікам прафэсарам Ланцкім.

Апека Уварава над шкоднікамі праявлялася нават і пасьля іх арышту. Ён сам заходзіў на кватэры шкоднікаў і выказваў сваё шчырае спачуваньне жонкам і сваякам арыштаваных. Чаго толькі варта яго гутарка з жонкай Барадзёнкі, які быў арыштаваны ДПУ! «Ня турбуйцеся, усё гэта лухта. Іх хутка вызваляць і мы зноў будзем працаваць разам».

Дырэктар Уваравы, ня гледзячы на пратэсты грамадзкіх арганізацый камбінату, асабіста пазбаўляў стыпэндыі студэнтаў-батракоў і бедняту і выдаваў стыпэндыі сыном і дочкам кулакоў (Афанасьсеў, Іванова, Асмолаў і інш.). Мы ўжо ня хочам тут падрабязна спыняцца на крымінальных злачынствах, якія мелі месца з боку дырэктара і яго прысьпешнікаў.

Вось пры такіх абставінах становішча ня дзіўным, чаму ў сьценах камбінату доўгі час арудавалі шкоднікі і чужыя партыі элемэнты.

Актыў навуковых работнікаў падбіраўся на сямейнай прымеце. Самапазаў—былы сакратар партыйнай ячэйкі, сын кулака, жулік з партыйным білетам, чорнасоценец, у свой час быў правай рукой дырэктара. Гэты чалавек у мінулым «верай і праўдай» служыў на блага «руская прастолу». З абвяшчэньнем мабілізацыі ў 1914 годзе, ня гледзячы на сваю маладосьць, ён пайшоў добраахвотнікам у царскую армію, дзе не

апартуністаў, трацкістаў, нацыяналістаў усіх масьцей, перараджэнцаў, ашуканчым шляхам пралезшых у партыю,

КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б БУДЗЕ Ў ПЕРШЫХ РАДОХ ЗМАГАРОЎ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Адзначыць чыстку баявой работай па перабудове Віцебскага вузла

Роўна месяц, як праходзіць чыстку партыйная арганізацыя віцебскага чыгуначнага вузла. Аднак, гэту важнейшую палітычную справу партарганізацыя ня здолела ўвязаць з барацьбой за выкананьне пастаўленых перад транспартам гаспадарча-палітычных задач, з барацьбой за неадкладнае выкананьне пастановы ЦК і СНК аб рабоце чыгуначнага транспарту.

Пастанова ЦК і СНК знайшла самы гарачы водгук з боку віцебскіх чыгуначнікаў. Рад лепшых інжынераў-актывістаў патрабавалі неадкладнага адпраўленьня іх на работу ў нізавыя вытворчыя зьвяньні. Але ўжо сёньня прыходзіцца канстатаваць наліччя супраціўленьня правядзеньню ў жыцьцё гэтай важнейшай партыйнай і ўрадавай дырэктывы з боку раду кіруючых працаўнікоў.

Гарком КП(б)Б зусім правільна паступіў, калі выключыў з радоў партыі сакратароў парт'ячэек кіраўніцтва, раёну і 6-га будаўнічага раёну Сьвістуноеа і **Аржанова**, якія праявілі апартунізм і чыгоўніцкае благадушша ў выкананьні рашэньняў ЦК і СНК.

Чым, як ня простым сабатажам у рэалізацыі гэтай важнейшай партыйнай і ўрадавай дырэктывы можна назваць той факт, што інжынэра спэцыяліста па паравозным частцы тав. **Міна**, першым падаўшага заяву аб неадкладным яго адкамандыраваньні ў цэх, не накіравалі непасрэдна на вытворчасьць, а пакінулі працаваць пры вучпрафсачы? Аб гэтым факце ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду добра ведаў сакратар парт'ячэйкі Сьвістуноў, ведаў і ніякіх мер ня прымаў.

Хіба дапушчальна тое, што на вачох у сакратара парт'ячэйкі 6-га будаўнічага раёну Аржанова, інжынэр-камуніст **Шаліма** чатыры дні ўвыльваў ад пасадкі на лінію ў якасьці начальніка дыстанцыі? Шаліма таксама добра ведаў, што на будаўнічым вучастку, дзе ён зьяўляецца парткіраўніком, пастанова ЦК і СНК, як і дысцыплінарны статут, яшчэ да гэтага часу не прапрацаваны сярод рабочых, але як і Сьвістуноў ёй нічога практычнага не зрабіў, каб ўдарыць па сабатажніках, заядлых апартуністах, якія тармозяць рэалізацыю пастановы ЦК і СНК.

На шлях простага ашуканства партыі і ўраду пайшоў сакратар парткалектыву службы эксплёатацыі **Гедасін**. Яго заява, што перабудова ўжо праведзена — ня што іншае, як бессаромная хлусьня. Усе абмены пляцу, як і раней, работаюць па старому. Пасада тэхпрому яшчэ не ліквідавана. Пракінутыя з раёну на работу ў пасажырскую станцыю **т. т. Пярлоў і Бажанаў** да выкананьня сваіх абавязкаў не прыступілі. Яшчэ сядзіць у сваім кабінэце **Майсеенка**, прызначаны на пасаду загадчыка таварнай канторы.

Ня лепш і на службе пяці. Памочнік дырэктара дэпо на масавай рабоце тав. **Зубец** замест таго, каб пайсьці на работу ў паміжцэхавы цэх у якасьці сьлесара, аказаўся на рабоце ў мясцкоме. Загадчык тэхпрома дэпо тав. **Шур** у сувязі з ліквідацыяй данай пасады зусім зволен з чыгункі, у той час, калі ўпаўне магчыма было скарыстаць яго на рабоце ў нізавым вытворчым зьвяне. Інструктар тэхпрому тав. **Лайко**, які пазінен быў пайсьці работаць у якасьці пам. машыніста, пайшоў у адпачынак — і гэта тады, калі ў памочніках машыніста адчуваецца патрэбнасьць.

Узорам бюракратычна-фармальнай перабудовы можа служыць той факт, што ў дэпо і дагэтуль яшчэ існуюць манцёры, у той час, як пастанова ЦК і СНК выразна гаворыць аб скасаваньні пасады манцёраў і прымацаваньні іх да вытворчых брыгад у якасьці брыгадзіраў. Адно толькі пераймінаваньне манцёра ў брыгадзіра, як гэта зрабілі ў віцебскім паравозным дэпо, ні ў якім разе не гаворыць аб якой-небудзь перабудове.

Што датычыцца ўзбудзьненьня норм, то на радзе вучасткаў гэта работа праведзена як належыць пры ўдзеле майстроў і шырокіх рабочых мас. Ня так абстаіць справа ў цэху міжцэховаго ремонту і абточкі. Тут гэта сур'ёзная справа праводзілася без усялякага ўдзелу майстроў Угрумава і Каленкава, у выніку чаго ўзбудзьненьне норм праведзена тэхнічна неабгрунтавана.

У адказ на пастанову ЦК і СНК аб рабоце чыгуначнага транспарту паравозьнікі і рабочыя дэпо абвясьцілі ўнутрыдэпоўскі конкурс на колькасьць і якасьць рамонту паравозаў, на 100-процантную спаравую. Аднак, партыйная і прафэсыянальная арганізацыі ня здолелі гэты блыскучы пачын рабочых ператварыць у жыцьцё, дапусьцілі ў гэтай справе самацёк. У рэзультаце далей фармальнага абвяшчэньня конкурсу справа не пайшла.

Узяць хаця-б спэцрамонт. Пры абвяшчэньні конкурсу людзі ўзялі на сябе абавязак на працягу ліпеня ня толькі выканаць на 100 процантаў праграму па спэцрамонту, але і пакрыць прарыў за чэрвень і папярэднія месяцы. Гэта значыць, што на працягу ліпеня яны павінны былі выпусьціць з спэцрамонту 27 паравозаў, фактычна-ж на 20-е ліпеня выпушчана ўсяго толькі 14. Якасьць рамонту паказвае ўсё яшчэ вялікую колькасьць рамонтаў паўторных (у чэрвені 13, прыблізна такая-ж колькасьць у ліпені).

Спаравая ізда сыстэматычна зрываецца. Так, напрыклад, 20 ліпеня спаравая на паравозах пасажырскіх цягнікоў была выканана толькі на 80 проц., па таварных — на 84,3 проц. 19 ліпеня па пасажырскіх — 60 проц. і таварных — 73 проц. За трое сутак мелі месца 15 зрываў спаравай ізды, гэта значыць, што паравозы ня мелі сваіх гаспадароў.

Працоўная дысцыпліна на транспарце надзвычайна расхлябана. За прашоўшыя дні ліпеня толькі па дэпо мелі месца 16 прагулаў. Вялізарная колькасьць зрываў спаравай прыпадае таксама на прагулы, галоўным чынам з боку качагараў. Так, 20 ліпеня спаравую на паравозе Э-4395 сарваў качагар **Васюкоў**, зрабіўшы прагул. 19 ліпеня зрабілі прагул качагары паравозаў Э-60 і Э-5459 **Анупрэйў і Каратко**ў. Калі да гэтых паказчыкаў яшчэ дадаць тое, што процант хворых паравозаў надта вялікі (замест 13,69 проц. па плане — 19 проц. фактычна), што на халоднай прамыўцы паравоз у сярэднім прастойвае замест 42 гадз. — 50-52 гадз., то рэзультат фармальнай перабудовы віцебскага чыгуначнага вузла будзе відавочным.

Прайшоўшыя дні чысткі паказалі, што на вузле ёсьць добрыя камуністы, якія з гонарам нясуць высокае званьне бальшавіка. Машыніст-кандыдат партыі тав. **Шпакоўскі** лепшы ўзор таго, як камуніст павінен праяўляць сваю авангардную ролю на вытворчасьці.

Тав. Шпакоўскі на чыгунцы вось ужо 30 год, з іх 21 год працуе машыністам. Сваю адданасьць партыі і савецкай уладзе ён яшчэ даказаў у час грамадзянскай вайны, калі будучы машыністам бронепцягніка ня раз выратоўваў яго з-пад варожых гарматных стрэлаў.

На баявым пасту Шпакоўскі і зараз. Паравоз С-56 ён прыняў цяжка хворым, паламаным, разьбітым. Гэту машыну зараз не пазнаць — рэзультат добрага, доглядзу, непраўдажнага і сналчасовага рамонту. На гэтым паравозе тав. Шпакоўскі з сваёй брыгадай атрымаў у другім усесаюзным конкурсе другую прэмію—1.400 руб. За ўвесь час яго работы ў брыгадзе ня было ніводнага зрыву спаравай ізды. За май і чэрвень месяцы брыгада Шпакоўскага мела эканомію вугалю на 375 руб.

Такіх Шпакоўскіх на віцебскім чыгуначным вузле ня мала.

Паравозьнікі 1 рабочыя паўночна-заходняга дэпо **Астапаў, Кандрацьцеў, Савіч, Багданаў, Іцулевіч** і рад другіх— усё гэта лепшыя ўдарнікі, байцы ва тэмпы і якасьць. Гэта яны прышлі да чысткі з выкананьнем заданьня па прабегу паравоза-кілёмэтраў на 132 проц., з'эканомілі на рабсіле 1 матар'яле — 3.350 рублёў.

Разам з гэтым чыстка партыі паказала і другое. Чыстка паказала, што ў рады чыгуначнікаў, больш таго, у рады партыі пралезла нямала клясава-варожага элемэнту.

Напрыклад, **Пржавальскі** — член партыі, працуе ў вучпрафсачы другім работнікам па тарыфна-нармовачнай рабоце. Бацька яго дзваранін, багацейшы кулак, матка — дачка буйнага абшарніка. Дачку абшарніка Заначкоўскую, Пржавальскі ўстроіў рахункаводам на дарозе. На запытаньне старшыні камісіі на чыстцы аб розьніцы паміж задачамі першай і другой пяцігодкі гэты чужак адказаў: — тэмпы ў першай пяцігодцы былі нерэальныя, у другой яны крыху больш верныя. Пржавальскі ня верыць у рэальнасьць нашых пляноў, бо ўсім сваім нутром ён чужы нам элемэнт.

Машыніст **Пятроў Восіп** — член партыі з 1932 году. У мінулым — актыўны член рэлігійнага таварыства баптыстаў. У свой час меў цесную сувязь з вядомым заядлым контр-рэвалюцыянэрам Даскевічам і інш. Пятроў так і прызнаўся на чыстцы: «ведаў, што Даскевіч узначальваў контр-рэвалюцыйную арганізацыю, ведаў, але яму не перашкаджаў». Пятроў у сучасны момант мае сувязь з родічамі Даскевіча і былымі абшарніцамі — Велнаўскай і Паразевай. Гэта ён, Пятроў, зьбіраў падпіскі з хадайніцтвам аб невысяленьні кэндзэ. На вытворчасьці — адзін з горшых.

Машыніст **Будзько** — член партыі з 1925 году. За прагулы і лятунства быў разудараны, але ня выпраўсуя і зараз зведены з чыгункі. Вось ужо сем месяцаў, як ён ня плоціць членскія ўзносы, між тым зусім нядаўна купіў сабе дом.

Ісачэнка — рабочы цэху прамыўкі. Бацька яго кулак, выключаны з калгасу, судзімы за сабатаж хлебазагатовак, сям'я Ісачэнкі мела цесную сувязь з жандармерыяй і паліцыяй. Дзядзька яго, напрыклад, былы акалодачны надзіратель, яшчэ зараз знаходзіцца ў калгасе. Сам Ісачэнка адзін з вядомых дэзарганізатараў вытворчасьці: прагульшчык, ня выконвае распараджэньняў майстроў. У час падпіскі на пазыку гэты «камуніст» агітаваў рабочых су процэ падпіскі на пазыку.

Яго «калега» строгальшчык **Шупегін** —член партыі з 1932 году. Усе выступаўцы ахарактарызавалі яго як прагульшчыка і рвача. У 1918 годзе ён знаходзіўся ў кадэцкім корпусе Калчака.

Такіх Шупегіных, Ісачэнкавых, Пятровых, на вузле таксама нямала. Чыстка выкрыла іх сапраўдны твар. Але вось паглядзім, каму-ж даверылі адказны вучастак — кіраўніцтва паравозьнымі брыгадамі?

Загадчык паравозных брыгад, член партыі **Рэут** у 1917 годзе быў у партыі меншавікоў. У час Кастрычніцкага перавароту ўзначальваў забастоўку сабатажнікаў на чыгунцы. Актыўна выступаў на мітынгах супроць здачы чыгункі савецкай уладзе. Як клясава-варожы элемэнт зволены з Паўночна-Заходняй чыгункі, але здолеў зацісацца на МББ, дзе і праводзіць сваю разлагацельскую работу.

Вось каму даручылі кіраўніцтва паравозьнымі брыгадамі. Вось каму даверылі кіраваць барацьбой за стопроцэнтную спаравую ізду, за захаваньне паравозаў. Вось да чаго дайшла сьлепата партыйнага калектыву цяці. Пасьля гэтага ня будзе дзіўным, чаму штодзённа зрываецца спаравая, чаму па паравозы не пасьпеўшы выйсьці з рамонту зноў становяцца ў дэпо!

Чыстка партыі паказала, што большая колькасьць камуністаў абсалютна палітычна няпісьменная. Парт'ячэйка паравозьнікаў нічога не зрабіла для ўзьняцьця палітычнага ўзроўню сваіх членаў і кандыдатаў партыі. Партыйнамасавая работа сярод паравозьнікаў, работа партарганізатараў фактычна адсутнічае.

Неабходна таксама адзначыць, што ні парт'ячэйка паравозьнікаў, ні парткалектыў цяці нічога не зрабілі для прыцягненьня да чысткі партыі лепшых рабочых чыгуначнікаў. З 200 паравозьнікаў, якія могуць быць на сходзе, прысутнічае звычайна 60-70 чалавек. Актыўнасьць слабая, тры разы сходы былі сарваны.

Чыстка партыі на вузле працягваецца. Бюро ячэйкі і бюро парткалектыву цяці павінны арганізаваць масавую прысутнасьць рабочых-чыгуначнікаў на чыстцы, разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку работы ўсёй арганізацыі і кожнага камуніста.

Партыйная арганізацыя вузла павінна прыняць самыя рашучыя меры для неадкладнай рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб рабоце чыгуначнага транспарту. Віць, мацна біць на сабатажнікаў, якія супраціўляюцца рэалізацыі гэтай важнейшай партыйнай і ўрадавай дырэктывы!

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.
ПЯТРОВІЧ.

Да канца аздаравіць ячэйку ЦРК

Ужо больш як два тыдні прайшло, як партыйная ячэйка Віцебскага ЦРК прайшла чыстку сваіх радоў. Ячэйка Віцебскага ЦРК падышла да чысткі са значнымі прарывамі ў выкананьні пастаўленых перад ёю задач. Тавараварот другога кварталу выканан на 92,1 проц., плян чэрвеньскага тавараварату — на 81 проц. Адных таварных астач па ўсёй сыстэме ёсьць на 878 тыс. руб. Пляны папнакапленьня правалены. Плян другога кварталу выканан на 62,5 проц. Гэтыя факты сьвядчаюць аб усёй небясьпечнасьці становішча.

Замест сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за паляпшэньне рабочага снабжэньня ў ЦРК панавала безадказнасьць, разгільдзяйства, дробна-буржуазная расхістанасьць, сямейнасьць. Паасобныя камуністы скатываліся на пазыцыі клясавага ворага і часта дзейнічалі вусім адкрыта ў мэтах як мага больш пашкодзіць справе рабочага снабжэньня гораду. Ячэйка ЦРК хварэе ўсімі тымі недахопамі віцебскай партыйнай арганізацыі, якія яркa адзначаны ў пастанове ЦК КП(б)Б.

Былы сакратар партыйнай ячэйкі **Танхельсон** паклала моцны фундамант для разлажэньня значнай часткі ячэйкі. За два гады яе кіраўніцтва славесная дэкларацыйнасьць падменьвала сапраўдную барацьбу за ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду ў галіне рабочага снабжэньня. Ячэйка зусім не займалася вытворчымі пытаньнямі. Амаль ні на адным бюро ячэйкі, ні на адным партыйным сходзе з усёй сур'ёзнасьцю не разьбіралася пытаньне аб прычынах зрыву самазагатовак. Бюро партыйнай ячэйкі ня турбавала тое, што ў сэктары загатовак ЦРК сядзяць былыя гандляры **Цёмкін і Барадулін**, якія сыстэматычна, з дакады ў дэкаду правальваюць пляны самазагатовак. Яно штамавала факты, ня ўжывала рашучых бальшавіцкіх мер да наладжаньня гэтай справы. Ніколі ячэйка не разьбіралася і ня бачыла ўзрастаючых выпадкаў растрат, якія за 2-гі квартал гэтага году дасягнулі больш 100 тыс. руб., што тавары да спажыўца даходзяць толькі праз 30 дзён пасьля іх паступленьня на склад, што паасобныя камуністы — загадчыкі крам трымаюць пад спудам горы востра-дэфіцытных тавараў (магазын № 27).

Справа ніколькі не палепшылася пры новым сакратары партыйнай ячэйкі **Нэйдліне**. Гэты проста лічыў, што «ячэйка — гэта палітычны орган, і пытаньнямі вытворчасьці займацца неабавязкова. Наша задача — выхоўваць камуністаў». Але і палітычнае выхаваньне камуністаў пастаўлена дрэнна. Палітычны ўзровень большасьці членаў партыі вельмі нізкі. Па матар'ялах чысткі з 76 камуністаў — 31 палітычна абсалютна няпісьменныя. Кіруючыя работнікі, камуністы — загадчыкі аддзелаў не маглі адказаць на самыя элемэнтарныя палітычныя пытаньні. Партыйная вучоба была ў поўным загоне.

Камуністы былі прадастаўлены самім сабе, не адчуваючы ніякай партыйнай дысцыпліны. А адсюль—расхістанасьць, адсюль і карэньні вялізарных прарываў, з якімі ячэйка падышла да чысткі. Камуністы, асабліва нізавікі, па 2-3 месяцы не наведвалі сходаў (Карпенка), не плацілі па некалькі месяцаў партузносаў, адрываліся ад палітычнага і грамадзкага жыцьця, станавіліся абсалютна апалітычнымі, што яркa адчулася ў часе чысткі ячэйкі.

У большасьці партсходы, дзе разьбіраліся жыцьцёвыя пытаньні, прыпачаліся закрытымі. Ячэйка адгарадзілася ад беспартыйных кітайскай сьцяной. Замкнутасьць, мэтады саноўна-панскага кіраўніцтва ячэйкай прывялі да групаўчыны, склок і іншых агідносьцяй. Толькі стратай клясавай пільнасьці можна тлумачыць той факт, што ў ячэйцы квітнеў букет перараджэнцаў, владзеяў і жулікаў. У ячэйцы заставаліся нявыкрытымі буждаўцы, меншавікі, якія глыбока затаіліся, прыкрылі сваю шкодную дзейнасьць партыйным білетам.

Вось **Варабёў** — загадчык арганізаванага сэктару праўленьня ЦРК. Сын кулака, які карыстаўся наёмнай рабочай сілай, Варабёў мае дзьве судзімасьці ў мінулым за развал двух кааператываў. Яго дзейнасьць была цалкам накіравана на зрыў веснавой сяўбы ў прыгараднай гаспадарцы Білева. У яго стале месяцамі ляжалі сотні рабочых скаргаў, якія заставаліся без адказаў. Масавая работа цалкам ім была правалена. І гэта нічым няпрыкрытае дзейнасьць клясавага ворага не сустракала ніякага адпору. Нават больш, ён не атрымаў ні аднаго спагнаньня і мог беспакаранна шкодзіць на пасадзе загадчыка аддзела сэктару і намесьніка старшыні праўленьня.

Сын гандляра **Бляхман**, утаіўшы сваё сацыяльнае паходжэньне ад партыі, будучы загатоўшчыкам нічога не загатаўляў, а транжырыў дзяржаўныя сродкі. Яго камандыроўкі выраставалі за паць дзён у 200—300 руб., а карысьці ня было ніякай. Гэта тып рвача, шкурніка і бюракрата. У часе сьнежнай адгрузкі гародніны ён заяўляў: «Мне плацяць толькі за 8 гадзін работы і больш працаваць я вам не павінен». Тэрміновую адгрузку гародніны ён сарваў. І гэты рвач і жулік арудваў таксама беспакарана.

Бараноўскі — загадчык сталоўкі, пачаў «эканомію» ў 142 кілёграмы хлеба, якія прысвоіў сабе, перавыдаткоўваў дзяржаўныя грошы, займаўся вымагацельствам ад арганізацый, якія ён абслугоўваў, прыкрываў растратчыка — свайго намесьніка, плаціў сабе за лішнія прапрацаваныя гадзіны. На гэтага жуліка ня лічылі патрэбным да чысткі зварачаць увагу.

Акрамя гэтага, буйна расьцьвіў бюракратызм. Вось бюракрат **Сьвініцкі** — аматар тапіць наведвальнікоў ад стала да стала, рвач і шкурнік, пры падпісцы на пазыку ўтаіў свой фактычны заработак.

Танхельсон — загадчык аддзелу кадраў праўленьня ЦРК; была ў Бундзе з 1917 па 1920 год. На чыстцы яна выстаўляла Бунд у якасьці «самай рэвалюцыйнай партыі». У 1929 г. выключалася з партыі. Будучы загадчыцай крамы растраціла 1.000 руб. Як сакратар партыйнай ячэйкі яна зьяўлялася актыўнай абаронцаю растратчыкаў. За час яе дзейнасьці выпадкі растрат у магазынах шпарка расьлі. У 1930 годзе—12.349 руб., у 1931 годзе—22.455 руб., у 1932 г.—55.462 руб.

Частка адданых рабочых вылучэнцаў, прышоўшых у кааперацыю ад варштату, не знаходзіла сабе абсалют на ніякага падтрыманьня. Іх ініцыятыва задушалася бюракратызмам. У мінулым—самыя актыўныя рабочыя, яны адрываліся ад партыйнага жыцьця, тупелі. Яны, паказваючы ўзоры сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за выкананьне гандльфінпляну, за лепшае абслугоўваньне рабочых, цалкам адданыя рабоце,—заціраліся, з імі ня лічыліся, ні адзін з іх ня мае ніякай партыйнай нагрузкі. Вось літаральна словы **Борзка**, былога фурмана, які зараз працуе ў кааперацыі: «Я хачу працаваць, але мяне ў работу ніхто ня ўцягвае і я асабіста лічу сябе камуністам на паперы выключна з-за кіраўнікоў ячэйкі, якія працаваць з намі ня хочуць. Ма гу-ж я працаваць на вытворчасьці, хварэю-ж я за кожную непаладку, мог-бы я быць і добрым камуністам».

І такіх Борзкаў, адарваных па віне бюро партыйнай ячэйкі і парт'ячэйкі ў цэлым ад жыцьця, у ячэйцы налічваецца больш 25 чалавек. Адсюль і ня дзіва, што 15 камуністаў нізавікоў пераведзены ў спачуваючыя.

А ў ячэйцы, нават і пасьля чысткі, урокі якой зусім ня ўлічаны, расквітаці склокі і групаўшчына. Ні адзін сход, ні адно бюро партыйнай ячэйкі не абыходзіцца без агідных антыпартыйных склок паміж сакратаром партыйнай ячэйкі Нэйдліным і старшынёй мясцкому Бэрлінай. Сакратар ячэйкі Нэйдлін лічыць непатрэбным прысутнічаць на пасяджэньнях мясцкому, а Бэрліна плаціць тэй-жа манэтай, не зьяўляючыся на партыйныя сходы.

І дагэтуль непарушна на пасадзе намесьніка старшыні праўленьня, з маўклівай згоды старшыні праўленьня ЦРК Гіцовіча, «здравствує» Варабёў. Непахісна сядзіць на сваім крэсьле Танхельсон.

Бюро ячэйкі на 30 проц. складаецца з «мёртвых душ», накшталт Ягорава і Зішкевіч, якія нават не працуюць у апараце ЦРК. **Трэба асабліва падкрэсьліць, што чыстка партыі не паслужыла ўрокам для парт'ячэйкі ЦРК.**

Пастанова **ЦК КП(б)Б** аб віцебскай арганізацыі не парушыла заспакаеньня, людзі лічаць, што галоўнае зроблена, чыстка пройдзена. Нэйдлін усё адкладваў абгаварэньне пастановы ЦК, заяўляючы, што з гэтай справай можна пачакаць.

Трэба сказаць, што чыстка няпоўнасьцю вытрахнула ўсю гніль з ячэйкі. Так, пасьля чысткі камуніст **Проў** — пам. дырэктара сьвіной базы злоўлен пры разбазарваньні збожжа са сьвіной базы, загадчык магазыну камуніст **Дайтэр** наўмысна затаварваў соль і запалкі і г. д. **Пастановай бюро гаркому бюро парт'ячэйкі распушчана і Нэйдлін зьнят з работы.**

Гарком павінен зрабіць рашучы пералом у рабоце ячэйкі з тым, каб ЦРК мог сапраўды забясьпечыць выкананьне пастаноў партыі аб рабочым снабжэньні.

С. Раскін.

АД РЭДАКЦЫІ: Факты, якія маюць месца ў ячэйцы Віцебскага ЦРК пасьля чысткі, гавораць аб неабходнасьці падвергнуць ПАЎТОРНАЙ ЧЫСТЦЫ кіраўнікоў праўленьня і ячэйкі, ня глядзячы на тое, што бюро распушчана.

РЭДАКЦЫІ „ЗЬВЯЗДА"

Бальшавіцкай «Зьвязьдзе» — цэнтральнаму органу ЦК КП(б)Б — гарэ шле прывітаньне ад бальшавікоў Віцебшчыны!

Пленум ЦК і ГКК КП(б)Б сумесна з актывам адзначае тую выключна вялікую ролю газэты «Зьвязда», якая дапамагала і дапамагае выкрыць гны бокія прарывы ў рабоце арганізацыі, выкрыць контр-рэвалюцыйных беларускіх нацдэмаў, выкрыць праяўленьні ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шаві нізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, дапамагае выкрыць усіх тых хто імкнецца ідэалізаваць контр-рэвалюцыйны Бунд, дапамагае змагацца з дробна-буржуазнай расхлябанасьцю, расхістанасьцю, сямейнасьцю, групоўшчы най, за жалезную бальшавіцкую дысцыпліну, за баявое высокаякаснае пра вядзеньне ўборкі і забясьпячэньне першачарговай задачы сельска-гаспадарчы прадукцыі дзяржаве, за поўнае выкананьне усіх гых задач, якія пастаўлены ЦК КП(б)Б перад віцебскай партарганізацыяй.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве баявая бальшавіцкая «Зьвязда»!

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ ВІЦЕБСКАГА ГК І ГКК КП(б)Б РАЗАМ З ПАРТ АКТЫВАМ.



Гасразрахунковая брыгада імя XVII партканфэрэнцыі — першая па выкананьні прамфінпляну. Атрымала пераходную прэмію — бюст тав. Сталіна. (Акулярная фабрыка).

За пераходны сьцяг гаркому

Сапраўдная, бальшавіцкая падрыхтоўка да чысткі партыі на **акулярнай фабрыцы** пачалася толькі з сакавіка, калі на чале парткалектыву стаў новы сакратар тав. **Цал**.

Тав. ЦАЛ правільна пачаў з перабудовы партмасавай работы, пераносячы яе з габінэтаў — у цэх, да станка. Пачалі перабудову з адстаючага шліфавальнага цэху. Тут найбольш няправільна быў расстаўлены партсілы: у першай зьмене два камуністы, у другой зьмене — 20. Па-першае, расставілі партыйцаў па зьменах роўнамерна. Лічылася з характарам вытворчасьці шліфавальнага цэху (раскідапасьць) арганізавалі 4 партвучасткі, вызначылі 4-х партарганізатараў: вучастак вялікіх машын, кантрольнае аддзяленьне, малыя машыны і кантроль чашак.

Партгруп таксама раней ня было. Тав. ЦАЛ арганізаваў: у зборачным цэху 4 партгрупы, у падрыхтоўчым — 3 і адзін партвучастак. Партарганізатарамі вызначаны лепшыя камуністы.

Такім чынам, зараз непасрэдна каля станка сканцэнтравалася партыйная палітычная, масава-растлумачальная работа, непасрэдна зьвязаная з задачамі выкананьня прамфінпляну.

Перабудавалі на фабрыцы і прафработу па тым жа прынцыпе, што і партыйную.

Рыхтуючыся да чысткі партыі, арганізавалі школы-курсы на павышэньні палітузроўню партыйцаў. Да кожнага таварыша парткалектыў меў індывідуальны падыход. Склалі тры групы: для слаба падрыхтаваных кандыдатаў партыі, для таварышоў з сярэдняй падрыхтоўкай і для больш моцных. Партвучобай у гэтых групах ахапілі 110 чалавек. Тут вывучалі праграму, статут і гісторыю партыі, зьвязваючы з сучаснай рэчаіснасьцю. Парткаты фабрыкі ў колькасьці 21 чал., арганізаваны ў 4-ю групу, займаўся вывучэньнем больш складаных пытаньняў марксыцка-ленінскай тэорыі, яноўжа ўвязваючы іх з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

З 140 камуністаў лепшымі ўдарнікамі зьяўляюцца 120 чалавек. 7 чалавек — героі пяцігодкі. З агульнай колькасьці 599 рабочых ударніцтвам ахоплена 318 чалавек, або 56,6 проц. Пры гэтым усе гэтыя таварышы — ударнікі на справе, а не на паперы.

Калі раней асобныя камуністы ня выконвалі прамфінпляну і не лічылі гэта за ганьбу для камуніста, дык зараз ударніцтва стала ня толькі для камуніста, але і для беспартыйных рабочых справай гонару.

Вось некаторыя камуністы і камуністкі, што сваёй працай на вытворчасьці і ў грамадзкім жыцьці паказваюць узоры бальшавіцкай вытрыманасьці, сьвядомасьці, дысцыплінаванасьці, адданасьці партыі.

САЛАЎЁВА ЗІНА — работніца зборачнага цэху, сакратар цэхавай парт'ячэйкі. Зараз — яна на курсах парт-актыву пры ЦК КП(б)Б. Яна — заўсёды ўперадзе сярод рабочых. Асабістым прыкладам паказвае магчымасьці выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. За ёй сьледуюць другія камуністы, за камуністамі — беспартыйныя. У выніку — цэх заўсёды перадавы.

БАГАМОЛАВА ЛІЗА — работніца падрыхтоўчага цэху. Сакратар парт'ячэйкі. Герой пяцігодкі. Арганізавала вакол сябе вялікі актыў з камуністаў і беспартыйных рабочых. Прамфінплян у гэтым цэху заўсёды выконваецца і перавыконваецца.

КРЫШАНАВА — работніца шліфавальнага цэху, адстаючага раней. Працуе каля электрычнай печы на кітоўцы антычных шкел. Нормы перавыконвае сыстэматычна. Раней яе норма была — 525 шкел у зьмену, давалі значна больш. Пры перагляданьне норм яна высунула сустрэчную лічбу —650 шкел у зьмену, выконвае-ж 700. Браку няма.

Крышанава была няпісьменнай. Парткалектыў прымацаваў да яе добра пісьменную камсамолку. Вынік— лепшая ўдарніца партыйка тав. Крышанава стала пісьменнай.

Камуніст **ЯРШОЎ** — лепшы ўдарнік шліфавальнага цэху; ДУК, ЯКАБСОН — лепшыя ўдарнікі паяльнага аддзяленьня; ФРЫШ — лепшы ўдарнік цэху пробнай падрыхтоўкі. Шмат іншых камуністаў заняли сапраўдную авангардную ролю на вытворчасьці.

Перабудова партмасавай работы перанясенае не ў цэх, да варштату забясьпечыла разгортваньне самакрытыкі, рост ударніцтва. У выніку выкананьне прамфінпляну рэзка падняслося ўверх. Калі ў студзені прамфінплян выконваўся на 70 проц., у лютым — на 90, дык у сакавіку ўжо на 102 проц. Калі за першы квартал прамфінплян быў выканан на 90,9 проц., дык у другім квартале — на 116 проц. А разам за першае паўгодзьдзе — 102 проц. Значыць, заспачынаюць на першаму кварталу ўдарнай працай у другім квартале, у сувязі з падрыхтоўкай да чысткі, ліквідавана.

Адстаючы шліфавальны цэх, які ў першым квартале даў толькі 33 проц. пляну, у красавіку прамфінплян выканаў ужо на 109 проц. Праўда, гэтыя посьпехі канчаткова не замацаваны. Цэх загаворыць: крывая ідзе то ўверх то ўніз, аднак, да ранейшага ўзроўню не спушчаецца. Брак таксама зьнізіўся. Сабекошт прадукцыі ў другім квартале даў рэзкае паніжэньне — 4,66 проц., у той час як у першым квартале сабекошт прадукцыі павысіўся на 3,8 проц.

Акулярная фабрыка за ўдарнае распаўсюджаньне пазыкі другой пяцігодкі мае пераходны сьцяг гарсавету, за добрую прамоўку пасеваў на прыгараднай гаспадарцы — пераходны сьцяг гарпрафсавету і газэты «Віцебскі Пралетары».

У сувязі з чысткай партарганізацыі і пастановай ЦК КП(б)Б «аб становішчы Віцебскай партарганізацыі», камуністы і беспартыйныя рабочыя фабрыкі пачалі змагацца за першынства ў Віцебску, за пераходны сьцяг імя Гаркому КП(б)Б. Акулярная выклікала на сацспаборніцтва іншыя прадпрыемствы гораду.

Л. М.

Тав. БАЛАГОВА — герой першай пяцігодкі, сакратар парт'ячэйкі, лепшая камуністка. (Акулярная фабрыка).

ЛЁГІЧНЫМ ФРОНЦЕ

...ленцем і зусім ня прыцягвае да адказнасьці камуністаў, якія выступалі ў абарону гэтых антысавецкіх твораў.

Сакратар партыйнай ячэйкі кінаўстановы дае такія «дырэктывы» камуністам: «Вытворчасьць даражэй палітыкі». Стаўшы на шлях адрыву палітыкі ад эканомікі, ён тым самым даў прастор контр-рэвалюцыйным элемэнтам для іх шкодных дзейнасьцяй.

Дырэктар тэхнікуму, член партыі Шуваеў поўнасьцю зрослася з клясава-чужымі элемэнтамі, усялякім чынам іх пакрывае. Ён прымаў на работу сынаў попаў, абараняў заможна-кулацкую частку студэнцтва, звальняў з работы камуністаў, якія перашкаджалі яму праводзіць падрыўную работу і г. д. Кіраўніцтва вяло лінію на развал тэхнікуму. За два гады існаваньня сцэнарнага аддзяленьня на ім студэнты займаліся чым толькі хацелі, але не вывучэньнем тэхнікі і тэорыі сваёй вытворчасьці. У выніку два гады прапалі дарма і прышлося пераесьці сцэнарнае аддзяленьне.

У гэтай ячэйцы былі факты сканаваньня элемэнтарнейшых разуменьняў ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі. У свой час «Зьвязда» пісала аб выступленьні Рубінштэйна і Кагана, якія крытыкавалі праяўленьні вялікадзяржаўнага шавінізму з нацдэмаўскіх пазыцый. Ячэйка не зрабіла поўнасьцю вывадаў для сябе і гэта адбілася на ўсёй яе рабоце.

Аналягічныя факты перараджэньня асобных камуністаў, арсчпчаньня іх в кулацкімі, клясава-варожымі элемэнтамі мы сустракаем і ў педагагічным інстытуце.

«Правда» і «Зьвязда» ў свой час шырока асьвятлілі сутнасьць скажэньня лініі партыі, якія мелі месца ў гэтым інстытуце. На чыстцы выявіўся цэлы рад далатковых матар'ялаў, характарызуючых кепскае становішча на гэтым важнейшым вучастку.

Дацэнт Шафіраў у сваіх выкладаньнях скажае асноўныя ўстановы партыі. Напрыклад, ён пазьвае нашу прамысловасьць «сацыялістычным тыпам гаспадаркі, а калгасы—прадпрыемствамі пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу». Ён высоўвае і другую тэорыю, што «бядняк-некалгасьнік зьяўляецца ворагам савецкай улады». Трудна сказаць, каб чалавек, маючы скончаную вышэйшую адукацыю, мог проста па свайму «недамыслію» блытацца ў настольні элемэнтарных пытаньнях палітычнай партыі. Тут мы маем справу з чалавекам, які нічога агульнага ня мае з партыяй Леніна, які сьвядома скажае яе лінію.

Кахаеноўскі—выкладчык эканомпалітыкі, да рэвалюцыі бацька яго быў вялікім старшынёй і меў звыш 30 дзесятін зямлі. Зьвязаны сямейнымі пінямі з контр-рэвалюцыйнымі папоўскімі элемэнтамі. Перарадзіўшыйся камуніст. У выкладаньні свайго прадмета даказваў недакладнасьць палітыкі партыі, нак

1 жніўня—усебеларускі чырвоны абоз са збожжам

РАЗБЬІЦЬ СПРОБЫ КЛЯСАВАГА ВОРАГА САРВАЦЬ ПЕРШАЧАРГОВУЮ ЗДАЧУ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ

ДВА СЫГНАЛЫ

Сёньня мы зьмяшчаем дзьве тэлеграмы з Рэчыцы і з Сіроціна, якія паўинны прыкаваць сур'ёзную ўвагу.

Гэтыя тэлеграмы — два сыгналы аб манэўрах клясавага ворага ў яго супраціўленьні пасьпяховаму правядзеньню ўборкі і цьвёрдых паставак.

Выкарыстоўваць нязкытыя яшчэ дробна-ўласьніцкія настроі адсталых груп калгасьнікаў, распальваць сярод іх кулацка-рэакцыя тэндэнцыі—стары ўлюбёны мэтад кулацтва і яго агентуры. Лёзунгу — «першы абмалот—дзяржаве» клясавы вораг процістаўляе свой кулацкі лёзунг «спачатку сабе, а потым дзяржаве».

Праўленьне калгасу «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», Рэчыцкага раёну замест таго, каб арыентаваць масу калгасьнікаў на першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай, само паддалося на вудачку клясавага ворага і выкінула кулацкі лёзунг: «Увесь ураджай з першага абмалоту — на аванс».

Другі сыгнал з Сіроціна з усёй паўнатой выкрывае новую кулацкую тактыку. Канчаткова разьбіты пасьпяховым правядзеньнем веснавой сяўбы, бачачы вялізарны ўздым і энтузіязм калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, іх гатоўнасьць да ўдарнага правядзеньня ўборкі і збожжаздачы, клясава-варожыя антысавецкія элемэнты прабуюць зьнізіць ураджайнасьць калгасных палёў шляхам жніва нявысьпеўшага, яшчэ зялёнага жыта. Як паведамляе наш карэспандэнт, факты жніва зялёнага жыта за апошні час множацца, асабліва ў МІШКАЎСКІМ і АМБРОСАВІЦКІМ сельсаветах, Сіроцінскага раёну. Відаць, у гэтых сельсаветах антысавецкія кулацкія элемэнты зьвілі сабе моцнае гняздо.

Задача партыйных арганізацый Рэчыцкага і Сіроцінскага раёнаў — рашуча і да канца выкрыць гэтыя новыя манэўры клясавага ворага, даць бязьлітасны адпор іх канкрэтным юсьбітам і выканаўцам кулацкіх лёзунгаў. Вядучы бязьлітасную барацьбу з зацяжкай уборачных работ, трэба з усёй рашучасьцю біць і па спробах жаць жыта зялёным, нявысьпеўшым. І тое і другое — удар па ўраджайнасьці.

Сыгналы з Рэчыцкага і Сіроцінскага раёнаў павінны быць улічаны УСІМІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯМІ БССР. Трэба павесьці шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-сярэдняцкіх мас аднаасобнікаў, растлумачыць ім, да чаго накіраваны кулацкія спробы зьнімаць жыта зялёным і сарваць першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай пад шырмай розных авансаў.

Кулацка-рвацкім тэндэнцыям—бязьлітасны адпор!

РЭЧЫЦА, 24.

Раённая газэта «РЭЧЫЦКАЯ ПРАЎДА» сыгналізуе аб грубейшых скрыўленьнях у практыцы першых дзён уборкі.

Паасобныя калгасы прабуюць увесь першы абмалот выкарыстаць для авансу.

Праўленьне калгасу «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» абвясьціла ўсім калгасьнікам, што ўвесь ураджай з першага ўбранага гэктара жыта будзе раздан па авансах.

Выкананьне збожжаздачы адкладваецца на другую чаргу. Кулацкая практыка гэтага праўленьня ня сустрэла належнага адпору.

Жнуць жыта зялёным

СІРОЦІНА. (Па тэлеграфу ад нашага кар.).

Жыта палілося, пабурэла, аднак, яшчэ ня высьпела. Між тым факты жніва зялёнага жыта множацца, асабліва ў Мішкаўскім і Амбросавіцкім сельсаветах. Жнуць у большасьці аднаасобнікі.

Гэтыя кулацкія манэўры павінны спалохаць зьнішчальны адпор таксама як і спробы зацягнуць пачатак уборкі. Адно і другое нясе страты ўраджаю.

ГАТОВЫ ДА ЎБОРКІ І ЗБОЖЖАЗДАЧЫ

КАПЫЛЬ, 24. (Па тэлефону).

5 гадзін раніцы. На плац у Капылі з усіх куткоў раёну пачалі зьяжджацца фурманкі з чырвонымі сьцягамі.

Да 12 гадзін плац перапоўнен людзьмі. Сюды зьехалася каля 4-х тысяч калгасьнікаў, калгасьніц, бяднякоў і сярэднякоў аднаасобнікаў раёну дзейнасьці МТС. Сабраліся для таго, каб падагуліць вынікі сваёй работы, праверыць гатоўнасьць да ўборкі ўраджаю і здачы прадукцыі дзяржаве.

На трыбуне палітаддзел МТС, бюро райкому партыі, прэзыдыум РВК, удзельнікі другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы сацыялістычных палёў.

Нязлікая прамова начальніка палітаддзелу тав. Майсеева, кароткія прывітаньні райкому, райвыканкому і гарпрафсавету зьмяняюцца рапартамі 17 лепшых перадавых калгасаў раёну дзейнасьці МТС, якія дакладваюць мітынгу аб скончэньні сенаўборкі, аб поўным выкананьні пляну здачы сена дзяржаве і аб гатоўнасьці да ўборкі ўраджаю, да збожжапаставак.

Добрае сёлета збожжа,—кажа старшыня калгасу «Перамога» т. Гурыневіч.—Радуюцца нашы калгасьнікі, гледзячы на высокае, густаналітае жыта, на вельмі добры авёс, ячмень, шпаніцу. Не самацёкам, а ўпартай барацьбой супроць клясава-варожых элемэнтаў, апартуністаў і лодыраў, ударнай работай на палёх калгасьнікі нашага калгасу дабіліся гэтай перамогі. Зараз перад намі стаіць адна задача—сустрэць і ўбрацьь гэты ўраджай арганізавана, бяз страт, у тэрмін выканаць абавязкі перад дзяржавай. Тыя посьпехі, якія мы мелі ў часе веснавой сяўбы, праполкі і ўборкі сена, мы замацуем і надалей. Лепшыя ўдарнікі нашага калгасу ў часе касьбы паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Чыкоўскі Мікола, Лазоўскі, якія маюць па 55 год, замест нормы ў 0,33 га, скошвалі 0,55.

У нас усё падрыхтавана да ўборкі. 36 добрых коняй гатовы выйсьці хоць сёньня ў поле. Адрамантован с.-г. інвэнтар, замацован за брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі, складзены пастаянныя вытворчыя палявыя брыгады, за якімі замацаваны пэўныя вучасткі зямлі. Брыгады заключылі паміж сабой сацыялістычныя дагавары па ахове ўраджаю. Нам вылучаны фартаўнікі з лепшых калгасьнікаў - ударнікаў, аб'ездчыкі. Агледжаны добра сьвірны.

Бурнымі апладысмэнтамі было спатакана выступленьне калгасьніцы—дзлегаткі 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў тав. Краўчук, якая паведаміла аб заключэньні сацыялістычнага дагавору з Заходняй вобласьцю. Тав. Краўчук заклікала ўдзельнікаў мітынгу яшчэ шчыльней згуртавацца вакол палітаддзелу МТС, мабілізавацца на поўнае выкананьне пунктаў дагавору.

Калгасьнікі нашага Браткаўскага сельсавету,—кажа тав. Краўчук, — да мітынгу прышлі з поўнай гатоўнасьцю пайсьці ў бой за пасьпяховае выкананьне ўборачнай і цьвёрдых паставак. Да 19 ліпеня калгас поўнасьцю скончыў сенаўборку і здачу сена дзяржаве. Зараз мы далкам пераключыліся на ўборку ўраджаю і пастаўку збожжа і бульбы дзяржаве. 24 ліпеня пачынаем жаць жыта, рыхтуем чырвоны абоз па здачы збожжа.

— Такога ўраджаю, як у гэтым годзе,—кажа т. Краўчук з калгасу імя Молатава, нашы калгасьнікі ня памятаюць. Гэта вынік таго, што мы ня слухалі кулакоў і падкулачнікаў, якія заклікалі нас сеяць толькі тады, «калі нагрэецца зямля».

Мы добра падрыхтаваліся да ўборкі. Малатарні стаяць гатовымі да працы. Каб пазбавіцца страт, мы зрабілі зерняўлавіцелі, 9 тон збожжа, якое нам прылічваецца здаць, мы ў самы кароткі тэрмін здамо. Мы ўжо рыхтуем чырвоны абоз.

Тут-жа на мітынгу 18 калгасаў раёну дзейнасьці МТС заключылі паміж сабой сацыялістычны дагавор. Загадчыкі вытворчых вучасткаў і аграномы МТС на час уборкі і збожжаздачы ўзялі на сябе абавязацельства давесьці работу малатарань — станкоў да 1.100 цэнтнэраў у суткі, МО—900 цэнтн., БДО-34 — 450 цэнтнэраў, конныя малатарні—120 цэнтнэраў у суткі; забясьпечыць сваячасовую дачу вестак аб рабоце трактараў; арганізаваць шотненныя брыгадныя газэты ў калгасах.

15 вытворчых вучасткаў раёну дзейнасьці МТС падрыхтавалі ўжо 169 малацьбітоў, вагаўшчыкоў.

Сход аднадушна пастанавіў: арганізаваць чырвоны абоз імя Сталіна і калёны палітаддзелу МТС на менш чым з 775 фурманак з разьлікам на 250 тон збожжа.

4-хтысячны мітынг выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую ўборку і сваячасовую пастаўку збожжа дзяржаве Вузьдзенскі раён.

Марнаў.

Малатарні ўсё яшчэ чакаюць рамонту

ПОЛАЦАК, 23 (БЕЛТА).

Полацкая МТС мае 16 поўскладаных малатарань з іх адрамантавана да гэтага часу толькі 7. Рамонт ідзе чарапашымі тэмпамі, ня гледзячы на тое, што да ўборкі і малацьбы засталіся літаральна лічаныя дні.

У некаторых калгасах малатарні патрабуюць капітальнага рамонту. Так, у калгасе «Чырвоная зорка», Экіманскага сельсавету, паламаны драўляныя часткі малатарні, паспсаваны сіты, адсутнічаюць пасы.

МТС пакіравала ў калгасы «Новы шлях і «Трактар», Веркачэўскага сельсавету, і імя Молатава, Гомаўскага сельсавету, рабочых для рамонту малатарань, але рамонт ня робіцца з-за адсутнасьці запасных частак і пасаў. Загадчык вытворчым вучасткам Воспіпаў спакойна пачывае на лаўрах і ня думае пачынаць рамонту.

Сустрэць усебеларускую радыё-нараду падрыхтаванымі

25 ліпеня пад старшынствам загадчыка агітмасавага аддзелу ЦК КП(б)Б тав. Пыжыкова адбылася ўсебеларуская радыё-пераклічка агітмасавых аддзелаў райкомаў партыі. Агітмасаддзелы—Чэрвеньскі, Чырвона-Слабодзкі і Рагачоўскі зрабілі даклады аб ходзе падрыхтоўкі да ўсебеларускай радыё-нарады партыйнага, камсамольскага, калгаснага, сельсавецкага актыву па пытаньнях правядзеньня ўборачнай кампаніі і датэрміновай здачы збожжа дзяржаве.

Радыё-пераклічка выявіла, што падрыхтоўка да ўсебеларускай нарады, на якой выступіць сакратар ЦК тав. ГІКАЛО, не разгорнута. Так, у Чэрвеньскім раёне абмежаваліся толькі рассылкай паведамленьняў па ячэйках аб тым, што 29 ліпеня склікаецца ўсебеларуская радыё-нарада. Загадчык радыё-вузла ня прымае ніякіх мер, каб падрыхтаваць вузел і радыё-кропкі да радыё-нарады. Ён тлумачыць свае бязьдзейнасьць адсутнасьцю сродкаў для гэтай справы. Загадчык агітмасаддзелу РК КП(б)Б тав. Пузікаў ня прыняў адпаведных захадаў, каб забясьпечыць найбольшы ахоп актыву радыё-слуханьнем. Ён лічыць, што магчыма абхапіць радыё-слуханьнем ня звыш 400 чалавек.

Ад Чэрвеньскага раёну не адстае і Чырвона-Слабодзкі. Тут таксама абмежаваліся толькі рассылкай паведамленьняў па ячэйках, а работы не разгарнулі.

Параўнальна лепш стаіць справа ў Рагачоўскім раёне. Загадчык агітмасаддзелу РК КП(б)Б тав. Ваўчкоў дапажыў на радыё-пераклічцы, што апра ча пісьмовага паведамленьня актыў шырока всьвядомлен аб радыё-нарадзе праз тэлефонную і жывую сувязь. Мар куецца ахапіць радыё-слуханьнем 29 ліпеня ня менш 2.000 чалавек. Прыняты меры для праверкі і падрыхтоўкі радыё-прыёмнікаў і кропак.

Разгарнуў работу да радыё-нарады і Бабруйскі раён. Гэтае пытаньне абмеркавана 26 ліпеня на агульным раённым партыйсходзе. Пасьля сходу была праведзена нарада сакратароў парт'ячэек, на якой было абгаворана пытаньне, як лепш арганізаваць радыё-слуханьне, як забясьпечыць у ім найбольшы ўдзел актыву. У гэтым раёне разгарнулася работа па праверцы радыё-прыёмнікаў і кропак.

Вялізарнае палітычнае значэньне надыходзячай усебеларускай радыё-нарады патрэбуе сапраўды бальшавіцкай разгорнутай работы па забясьпячэньні найлепшай падрыхтаванасьці радыё-вузлоў і кропак і найбольшага ахопу актыву радыё-слуханьнем.

БЕЛТА.

Аб нявыезьдзе тав. Падліпскага ў сельсавет

Пастанова сакратарыяту Менскага гаркому КП(б)Б ад 25 ліпеня 1933 г.

Сакратарыят ГК КП(б)Б адзначае, што нявыезд тав. ПАДЛІПСКАГА, які агітмасам ГК быў вызначан упаўнаважаным Калодзішчанскага с/с па дарбу даўніцтве, зьяўляецца антыпартыйным учынкам. Падліпскі не давёў нават да ведама ГК аб нявыезьдзе, увёў у зман агітмас ГК. Выходзячы з гэтага сакратарыят ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За нявыезд у сельсавет тав. ПАДЛІПСКАМУ абвясьціць суровую вымову з папярджаньнем, прапанаваўшы яму сёньня-ж выехаць у сельсавет.

2. Прапанаваць бюро парткалектыву заводу «Бальшавік» высьветліць пытаньне аб правільнасьці атрыманьня ім камандыровачных у гарсавеце і справу аб гэтым перадаць у гарКК.

САКРАТАР МЕНГАРКОМУ КП(б)Б КУДЗЕЛЬКА.

Усім райкомам, ячэйкам КП(б)Б, ЛКСМБ, палітаддзелам МТС, саўгасаў

29 ліпеня, а 8-гадзіне ўвечары, ЦК КП(б)Б праводзіць Усебеларускую радыё-нараду партыйнага, камсамольскага, калгаснага, сельсавецкага актыву па пытаньнях правядзеньня ўборачнай кампаніі і датэрміновай здачы дзяржаве хлеба.

На нарадзе выступіць сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Арганізуйце шырокае масава-калектыўнае слуханьне. Забясьпечце выкарыстоўваньне ўсіх радыё-прыёмнікаў, радыё кропак.

ЦК КП(б)Б.

ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ВІНАВАТЫХ У НЕСВАЯЧАСОВЫМ ВЫКУПЕ ПАДРУЧНІКАЎ

РАДЫЁГРАМА

Усім старшыням РИК-РСІ

Дырэктыва па сваячасовым выкупе і давядзеньні стабільных падручнікаў да школ па радзе раёнаў **ня выконваецца.** *Падручнікі тыднямі ляжаць на станцыях,* **псуюцца.** *Нявыкупленыя падручнікі па Пятрыкоўскім раёне станцыяй* **прадаюцца з аўкцыёну.** *Прапаную праверыць работу па давядзеньні падручнікаў да школ. Вінаватых у несваячасовым выкупе* **прыцягвайце да судовай адказнасьці.**

Аб прынятых мерах паведаміце.

Намесьнік наркома РСІ КОНІК.

Да рэцэнзіі на часопісь „Камуністычнае выхаваньне"

У № 117 (4661) газэты «Зьвязда» была зьмешчана рэцэнзія Ю. Дардака на часопісь «Камуністычнае выхаваньне». Аўтар, крытыкуючы артыкул тав. Брыгневіча «Год барацьбы за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе» («Кам. выхаваньне» № 7-8), увёў рэдакцыю ў зман, падаўшы наступную вытрымку з гэтага артыкулу: «Сярэднюю пасьпяховасьць вучняў школ БССР у 87-88 проц. трэба прызнаць яўна здавальняючай».

Фармулёўка «яўна здавальняючай» зьявілася тэхнічнай памылкай, аб чым рэдакцыя часопісі ў № 9-10 часопісі дала папраўку, што трэба чытаць ня «яўна здавальняючай», а «яўна нездавальняючай». Пры тым уся накіраванасьць, увесь фактычны матар'ял у артыкуле тав. Брыгневіча зьяўляецца падмацаваньнем гэтага тэзісу аб яўна нездавальняючай пасьпяховасьці вучняў у школах БССР.

Між тым, аўтар рэцэнзіі Ю. Дардак, ні гледзячы на гэту агульную накіраванасьць артыкулу, ня гледзячы на папраўку рэдакцыі часопісі аб ёй аўтар памінае быў ведаць), учаліўшыся за памылкова зьмешчанае слова «здавальняючае», зрабіў наступны вывад:

«Тэзіс, што ў БССР пасьпяховасьць яўна здавальняючая, дэмабілізуе настаўніцтва. Палітычна такі тэзіс зьяўляецца «очковтирательством», — паказвае ў фальшывым сьвятле сапраўднае становішча навучаньня ў школах».

Рэдакцыя такую «крытыку» Ю. Дардака ня можа разглядаць інакш, як нядобрасумленную. Пры гэтым тав. Дардак самым недапушчальным чынам увёў у зман рэдакцыю «Зьвязды».

Сьпіс дакладчыкаў

па 30-годзьдзі 2-га зьезду партыі, прымацаваных да парткалектываў і ячэек

Тав. ПАССЭ (ЦК КП(б)Б—завод імя Варашылава, тав. ЗЛОТКІН (ЦК КП(б)Б)—зав. «Камунар», ШПІТАЛЬНІК (КІЖ)—зав. «Бальшавік», АГУРСКІ (гістпарт)—фабрыка «Кастрычнік», КЛІМАЎ (ЦК КП(б)Б)—зав. «Ударнік», ЛЯЎКОВА (гістпарт)—зав. імя Молатава, КАРТУКОЎ (ЦК КП(б)Б) — абутковая фабрыка, БАРАН (Бімзо)—фабрыка «Камунарка», ФОНГАУЗ (ЦК КП(б)Б) — хлебазавод, БУДКЕВІЧ (Бел АН) — шчотачная, БРАГІНСКІ (рэд. «Зьвязды»—друкарня імя Сталіна, КУЧЫНСКІ (ВКСГШ) — мясакамбінат, ЛЮБІН (дом Камасьветы) —кушнэрная фабрыка, КАПУЦКІ (гістпарт) — «8 сакавіка», АЛЯС (дом Камасьветы) — фабрыка «Усход, БУДАРНІН (школа прафруху) — зав. «Беларусь», ЛІЎШЫЦ (дом Камасьветы — хэмфармзавод, Вальфсон (школа прафруху) — «Чырвоны хэмік», ФРЫДЛЯНД (ЦК КП(б)Б) — сьпіртзавод, МАЙЗЭЛЬ (гістпарт) — зав. «Праператыр», ПУГАЧОЎ (гіспарт) — зав. «Чырвоны зопак», САЛДАЦЕНКА (партвыдат) — фабрыка імя Фрунзэ, ЕРАФЕЕЎ (ЦКК КП(б)Б) — «Чырвоны тэкстыльшчык», МАЙЗЭЛЬ (гістпарт) — фабрыка імя Крупскай, СЛАЎКОВІЧ (Белкаапсаюз)—пямцавая фабрыка, МА'ЯСІНА (саўбуд) — шклазавод, ЖУКАЎ (Бімзо)—арцель «Д. А.», ЛІЎШЫЦ (ЦК КП(б)Б) — электрастанцыя, АДЫНЕЦ (ЦК КП(б)Б) — абутковая фабрыка, ГУРВІЧ Ц. (Бімзо) — групком харчэвікоў, ОШАРАВА (БАН) —ВЭА, ФАЙНБЭРГ (Саюздрук)—БСІКА, БЯЛУГА (Наркамасьветы)—трактарн. майстэрн, ДЖЭЛЮК (рэд. «Зьвязды»)—«Чырвоны абутнік», ВАКСМАН (БКСаюз)—мантэкстыльпрамсаюз, РЫМША (НКАсьветы) — арцель «Чырвоны маталіст», МЭЕРОВІЧ (курсы партактыву) малочны завод, ШОКАЛЬ курсы партактыву — аўтарэснаб, МАКОЎСКІ (курсы партактыву—эўтамайстэрні, ЛЕВІН (ВКСГШБ)—дэпо паравознае, ІЛЬЛЮШЫН (БАН)—дэпо вагоннае, ЗАДЗЯРНЮК (ЦК КП(б)Б)—зав. імя Мясьнікова, МІНКІН (ЦК КП(б)Б) — служба шляху. КРЫВІЦКІ (БАН) — служба эксплёатацыі, ПАЛОНСКІ (ВПІ)—ДЗ-6, МАЦЬВЕЕНАК (БАН) — трампарк, АЛЯКСЕЙЧЫК (курсы партактыву) — Саюзтранс, ПРАЎДА (бібл. інст.) — Бел дзяржбуд, СТАНКОВІЧ (курсы партактыву) — Монбуд, ГОЛАНД (Наргасвучот) — Вадаканапрэст, ГАЛАНЗА (саўбуд) — Дом Ураду, БРАЎКОВІЧ (ДВБ) — Энэргабуд, КАРНЕЙЧЫК (БАН) — зав. стандартных дамоў, ДАВІДОВІЧ (Галоўліт) — шчацінная фабрыка, ЛЕВІН (гістпарт)—зав. малочных кіслот, ЕДЗЯДОВІЧ (ВКСГШБ) — фабрыка «Працюстра», ГОРФІНКЕЛЬ (гістпарт) — фабрыка ланцугоў «Галя», ЛАРАЧКІН (курсы партактыву) — цагельня № 1, ДАНІЛЬЧЫК (БАН) — цагельня № 1-3, ФРЫДМАН (БАН) — цагельня № 3, САЎЧАНКА (цэнтр. бібліятэка) — цагельня № 5-6, БАЛОТНІКАЎ (гістпарт) — цагельня № 8.

РЭЗЭРВ

Тав. РУДЫ, ЗЯРНІЦКІ (КІЖ); тав. ГЕРМАН; тав. ЛЕБЭНЗОН, СКУМАН (Бімзо); ЯНОЎСКІ (райваенкамат), ХАЛЕПА, ВІТЛІН (ЦК КП(б)Б).

Вылучаныя таварышы павінны зьвязацца з сакратарамі парткалектываў і ячэек, дагаварыцца аб дні і часе дакладу.

28 ліпеня, а 8 гадз. увечары, зьявіцца ў дом Камасьветы на даклад тав. Пасса аб 30-годзьдзі 2-га зьезду партыі.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

Рэйд ЦКК, гарКК, „Зьвязды", гарпрафсавету, газ. „Рабочий" і „Акцябр"

па праверцы рабочага шэфства і сацсумя шчэньня над дзяржапаратам

Сёньня, 28 ліпеня г. г., а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні ЦКК-НК РСІ Беларусі (Савецкая 55, пакой 21) адбудзецца інструкцыйная нарада вылучаных таварышоў для рэйду-праверкі рабочага шэфства над дзяржапаратам і сацумяшчэньня.

Зьявіцца на нараду пэўныя вылучаныя таварышы, а таксама сакратары парткалектываў прадпрыемстваў.

ЦКК, гарКК, ГАРПРАФСАВЕТ, «ЗЬВЯЗДА» «РАБОЧИЙ», «АКЦЯБР».

Паведамленьні

— Культпроп ГК КП(б)Б паведамляе, што 28-га ліпеня а 8-й гадз. увечары ў Доме Камасьветы (клюб Карла Маркса) для партыйна-камсамольскага актыву будзе прачытан даклад тав. Пасса на тэму: «30-цігодзьдзе 2-га зьезду партыі».

Уваход па білетах.

Білеты атрымаць у канцылярыі Дому Камасьветы.

Культпроп ГК КП(б)Б.

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 29 ліпеня 1933 г. адбудзецца пасяджэньне ПК па разглядзе наступных партпраў: Наркевіча Ф. Н., Захарава (Крычаўскі РВК), Вішнеўскай (Дзяржынская РКК), Уткіна, Сапаботуна Ю. А., Зепянкоўскага В. Г., Канавалава М. Ф., Марыскіна Р. М., Шэймана І. Ш. (Мазыр), Фікса А. В., Мусуліна В. М., Ганчарова А. П., Арлова М. В., Лося П. Н. (Бабруйск), Белчанка В. Ц., Ліхадзіеўскага М. Я., справы Гімінскага вучастку Прапойскага леспрамгасу.

Яўка памянёных т. т. абавязкова. Да дня разгляду спраў неабходна прадставіць у ПК характарыстыку ад парт'ячэек аб апошняй работе.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПЕРАД 1 ЖНІЎНЯ Ў КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ МАСАВЫЯ ВОБЫСКІ І АРЫШТЫ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ

БАЛГАРЫЯ

ВЕНА, 25. (БЕЛТА). Як паведамляюць з САФІІ, балгарскія ўлады працягваюць пад прадлогам «барацьбы з тэрарыстычнымі дзейнямі македонцаў» паход супроць рэвалюцыйных рабочых арганізацый (ачапленьне цэлых гарадоў, вобыскі, аблавы і г. д.), асабліва ў сувязі з надыходзячым антываенным днём.

У КАЗАНЛІКУ арыштаваны 10 салдат па абвінавачэньні ў «прыналежнасьці да нелегальнай камуністычнай арганізацыі» мясцовага пяхотнага батальёну. У ІХТЭМАНЕ арыштован дырэктар гімназіі. Ён абвінавачваецца ў «садзейнасьці камуністычнай арганізацыі моладзі». У САФІІ арыштавана каля 40 рабочых, селян і работнікаў разумовай працы за «хаваньне зброі».

Ваенны касацыйны суд у Сафіі зацьвердзіў рад сьмяротных прыгавораў, вынесеных ваеннымі судамі некалькім ваенным і цывільным па абвінавачаньні ў вядзеньні «нелегальнай камуністычнай прапаганды ў мэтах разпажэньня армії».

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 25. (БЕЛТА). Зварот эўрапэйскіх кампартый да працоўных з поваду антываенпэрыялістычнага дню, апублікаваны камуністычным друкам, скажон цэнзурай. Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, кампартыя Чэха-славакіі правядзе масавыя сходы і дэманстрацыі працоўных пад лёзунгамі барацьбы супроць фашызму і імпэрыялістычнай вайны і за абарону СССР.

ФІНЛЯНДЫЯ

ГЕЛЬСІНГФОРС, 25. (БЕЛТА). На асфальтавых маставых, ня гледзячы на суровы паліцэйскі нагляд, рабочыя ўначы напісалі лёзунгі супроць імпэрыялістычнай вайны. На сьцяне аднэй царквы ў ГЕЛЬСІНГФОРСЕ зьявіўся вялізарны надпіс «ЦАРКВА БЛАГАСЛАЎЛЯЕ ВАЙНУ».

РУМЫНІЯ

ВЕНА, 26. (БЕЛТА). З РУМЫНІІ паступаюць паведамленьні аб новых масавых арыштах рэвалюцыйных рабочых у сувязі з падрыхтоўкаю да першага жніўня. У БУКАВІНЕ арыштавана некалькі сот членаў кампартыі і іншых рэвалюцыйных рабочых арганізацый. У КЛУЖЫ (Семігрэдзьдзе), ня гледзячы на шматлікія арышты, на вуліцах, асабліва рабочых раёнаў, расклеены былі камуністычныя адозвы і пашыраліся лістоўкі, якія зьмяшчаюць першажніўненьскія пёзунгі.

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 26. (БЕЛТА). Як паведамляе «ЮМАНІТЭ», французкая кампартыя, унітарныя (рэвалюцыйныя) прафсаюзы і антываенныя камітэты Францыі ўзмоцнена рыхтуюцца да правядзеньня міжнароднага антываеннага дня. Кампартыя і ўнітарная канфэдэрацыя працы арганізуюць 30, 31 ліпеня і 1 жніўня 25 вялікіх мітынгаў у розных буйных гарадох Францыі.

У артыкуле аб першым жніўні «Юманітэ» заклікае рабочых, занятых на вытворчасьці, і беспрацоўных стварыць адзіны фронт барацьбы супроць ваеннай небясьпекі і супроць беспрацоўя.

КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ Ў ГАЛІЦЫІ

40 сялян забітых і тысячы арыштаваных

ВАРШАВА, 26. (ТАСС). Згодна дадатковых вестак, атрыманых з парляманцкіх колаў, ЛІК СЯЛЯН, ЗАБІТЫХ У ЧАСЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ У ГАЛІЦЫІ, ДАХОДЗІЦЬ ДА 40. ПАЛІЦЭЙСКІХ ЗАБІТА 13. У раёне селянскіх выступленьняў праведзены масавыя арышты. Турмы, а ў некаторых мясцох нават казармы, да адказу набіты тысячамі арыштаваных сялян. Хаця афіцыяльны друк і сьцьвярджае, быццам у Галіцыі наступіла поўнае заспакаеньне, паводле атрыманых вестак, у РАДЗЕ МЯСЦОВАСЬЦЯЎ ЯШЧЭ Ў АПОШНІЯ ДНІ ВЫБУХАЛІ ПААСОБНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ НА ГЛЕБЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЯ СЯЛЯН КАРНЫМ АТРАДАМ, накіраваным туды ўпадамі.

Перад агульнай забастоўкай гарнякоў Дамброўскага басэйну

ВАРШАВА, 26. (БЕЛТА). Гарняцкія прафсаюзы Дамброўскага вугальнага басэйну рашуча выказаліся супроць зьніжэньня зарплаты на 15 проц., якое намячаецца прадпрыемцамі. У аднэй толькі Верхняй Сілезіі агульная сума зарплаты зьніжана з 23 млн. злотых у 1929 г. да 7 млн. злотых. У некалі багатым Дамброўскім басэйне гіне ад голаду 150 тысяч поўнасьцю беспрацоўных. Столькі-ж — часткова беспрацоўных. Пэпэсаўцы загадзя арыентуюцца на недапушчэньне забастоўкі.

Срэбраныя грошы савецкіх правінцый Кітаю

ЧЭХА-СЛАВАЦКІ ЎРАД ЗАЦЬВЕРДЗІЎ КАНВЭНЦЫЮ 5 ДЗЯРЖАЎ АБ АЗНАЧЭНЬНІ АГРЭСАРА

ВЕНА, 26. (БЕЛТА). Паводле вестак прасканга карэспандэнта «Нэйе Фрэйе Прэсэ» ўчора чэха-славацкі савет міністраў зацьвердзіў падпісаную ў Лёндане СССР і краінамі Малой Антанты канвэнцыю 5 дзяржаў аб азначэньні агрэсара, даручыўшы Бэнэшу перадаць тэкст канвэнцыі прэзыдэнту Масарыку для ратыфікаваньня.

Закон аб прымусовай стэрылізацыі і кастрацыі ў Германіі

БЭРЛІН, 26. (БЕЛТА). У адпаведнасьці са сваёй «тэорыяй» аздараўленьня германскай расы шляхам дзяржаўнага ўмяшэньня, нацыянал-сацыялісцкі ўрад выдаў закон аб ПРЫМУСОВАЙ СТЭРЫЛІЗАЦЫІ АСОБ, ЯКІЯ ХВАРЭЮЦЬ СПАДЧЫННЫМІ ХВАРОБАМІ, І АБ КАСТРАЦЫІ СЭКСУАЛЬНЫХ ЗЛАЧЫНЦАЎ, якія становяць грамадзкую небясьпеку.

У выпадку супраціўленьня «прадугледжваецца паліцэйскае ўмяшаньне». Спадчыннымі хваробамі па закону лічацца: прыроджаная слабасьць розуму, шызафрэнія, спадчынная эпілепсія, сьлепата, глухата і апантанасьць маніяй, а таксама цяжкія выпадкі фізычнай уродлівасьці і цяжкія выпадкі алькагалізму. У афіцыёзным паведамленьні з гэтага поваду ўказваецца, што «ў адпаведнасьці з прогрэсам навуковага пазнаньня аб спадчыннасьці іншых хвароб, колькасьць выпадкаў, калі неабходна будзе ўжываць стэрылізацыі, можа быць павялічана».

Для вырашэньня пытаньня аб ужываньні стэрылізацыі стараюцца асобныя суды пад старшынствам дактароў, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе. У законе, між іншым, нічога не гаворыцца аб карах за злоўжываньні ў гэтай галіне.

Герынг падкуплівае ангельскі ўрад

ЛЁНДАН, 25. (БЕЛТА). Газэты паведамляюць, што пасьля так званага «паветранага палёту» на Бэрлін, Герынг зьявіўся ў ангельскае пасольства ў Бэрліне і афіцыяльна заявіў, што паколькі Англія снабжала Аўстрыю паліцэйскімі самалётамі, яна магла-б снабжаць імі і Германію. Пры гэтым ён дабавіў, што Германія гатова запляціць за гэтыя самалёты цану, якую ўкажа брытанскі ўрад. У адказе ангельскага ўраду гаворыцца, што ўказаньні на ангельскія пастаўкі паліцэйскіх самалётаў Аўстрыі не адпавядаюць сапраўднасьці, бо Аўстрыя не ў праве трымаць такія самалёты. Роўным чынам, паводле слоў адказу, Англія пазбаўлена магчымасьці пастаўляць паліцэйскія самалёты для Германіі.

Хваляваньні ў швэцкім ваенным флёце

СТАКГОЛЬМ, 26. (БЕЛТА). Матросы базы пэвэдзкага ваеннага флёту ў Карльскроне ў ліку каля 800 чалавек пазаўчора ў знак пратэсту супроць пагоршаньня харчаваньня калектыўна адмовіліся ад сьнеданьня. Сьледам за імі 80 ваенных служачых ваеннай вэрфі спынілі работу, таксама патрабуючы палепшэньня харчаваньня. Ня гледзячы на рэпрэсіі з боку камэндыру, мараякі правялі ўчора новую дэманстрацыю супроць дрэннага харчаваньня.

«Н'ю-Даг» паведамляе, што падобныя-ж дэманстрацыі адбыліся яшчэ ў мінулым тыдні, калі салдаты берагавой артылерыі ў Карльскроне абвясьцілі галадоўку.

Паведамленьне аб дэманстрацыях матросаў у Карльскроне выклікала на ваенна-морскай базе ў Стакгольме выступленьні салідарнасьці сярод морскіх салдат. Камандаваньне ваеннага флёту ў афіцыяльным паведамленьні прызнае пагоршаньне харчаваньня і абяцае палепшыць кантроль над снабжаньнем маракоў.

Буржуазны друк сьцьвярджае, што падзеі ў флёце ўзьніклі ў результаце камуністычнай прапаганды і карыстаецца імі, каб падкінуць шалёпае цкаваньне кампартыі і напрабуе ўвядзеньнем антыкамуністычных законаў.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЭЦ гор. Масква.

ГАРАДЗКІ САД
Дзяржцырк—Шапіто
СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА
ВЯЛІКАЯ ПРАГРАМА
Прыбылі і выступаюць новыя атракцыёны Трыо Фабры — жангл